№№131–132
(2859–2860)
4 верасня 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Народная Воля

*На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...*
Якуб КОЛАС

*Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93,
усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.*

*Заявление
Политсовета Объединенных демократических сил Беларуси*

Создание возможностей для реального общественного контроля за подсчетом голосов — необходимое условие признания итогов выборов соответствующими волеизъявлению народа Беларуси

Приветствуя освобождение белорусскими властями политзаключенных из международного списка узников совести,

Принимая во внимание сформулированные Объединенными демократическими силами условия, необходимые для проведения в Беларуси выборов в соответствии со стандартами ОБСЕ, а именно:

введение моратория на репрессии в отношении участников избирательного процесса;

включение представителей ОДС в состав избирательных комиссий;

регистрация кандидатов в депутаты из "единого списка" ОДС;

создание условий для беспрепятственных коммуникаций кандидатов в депутаты с избирателями, включая организацию дискуссий по актуальным проблемам в государственных электронных СМИ;

обеспечение возможностей наблюдателям реально видеть процедуру подсчета голосов и подведения итогов выборов участковыми и окружными избирательными комиссиями —

Политсовет объединенных демократических сил Беларуси по результатам состоявшейся дискуссии с участием представителей ОДС, выдвигавшихся кандидатами в депутаты Палаты представителей,

заявляет, что проходящая избирательная кампания не соответствует общепризнанным международным стандартам проведения прозрачных, свободных и справедливых выборов. Ее итоги не могут быть признаны соответствующими волеизъявлению народа Беларуси как внутри страны, так и международными организациями. Достаточным основанием для такого вывода является факт тотального немотивированного невключения органами местной власти представителей Объединенных демократических сил в состав избирательных комиссий. Среди членов избирательных комиссий представителей ОДС менее 0,05 процента, в то время как среди зарегистрированных окружными избирательными комиссиями кандидатов в депутаты представителей Объединенных демократических сил более четверти. Большинство участковых комиссий сформированы из членов, работающих на одном государственном предприятии (учреждении), а председателями этих комиссий являются, как правило, руководители этих предприятий (учреждений) или их подразделений. Фактическое отстранение представителей демократических сил от участия в подсчете результатов голосования является свидетельством нежелания действующей исполнительной власти провести прозрачные и справедливые выборы и создает условия для фальсификации волеизъявления избирателей;

предлагает исполнительной власти для исправления сложившейся ситуации, с учетом того, что участковые комиссии сформированы с нарушением принципа плюрализма и в количестве меньшем, чем допускает закон, до 08.09.2008 г. принять решение о доукомплектовании состава участковых избирательных комиссий представителями ОДС, выдвинутыми в их состав в соответствии с требованиями Избирательного кодекса Республики Беларусь, а также открыть государственные печатные и электронные СМИ для свободной дискуссии между кандидатами в депутаты по проблемам, представляющим интерес для белорусских избирателей. Для того, чтобы сделать осознанный выбор, у людей должно быть достаточно информации о кандидатах и их программах;

настойчиво рекомендует Палате представителей Национального собрания Республики Беларусь в экстренном порядке, до 20 сентября 2008 года, ратифицировать подписанную А. Лукашенко Конвенцию "О стандартах демократических выборов, избирательных прав и свобод в государствах - участниках СНГ", а Центральной и другим избирательным комиссиям в полном объеме применять положения пункта 3 статьи 14 "Статус и полномочия национальных наблюдателей" этой конвенции;

призывает международное сообщество в оценке избирательной кампании в Беларуси придерживаться международных стандартов и отказаться от соблазна признать итоги голосования, озвученные властями, в обмен на назначение депутатами представителей демократических сил;

рекомендует кандидатам в депутаты от ОДС сконцентрировать усилия на разъяснении избирателям причин, не позволяющих признать итоги выборов в Палату представителей справедливыми, а также на мобилизации избирателей на участие 28 сентября 2008 года в мирных акциях протеста против действия властей, фальсифицирующих волеизъявление граждан;

предлагает в избирательных округах, где власти отказали в регистрации демократических кандидатов в депутаты, организовать работу по информированию избирателей об отсутствии реального выбора и срыве явки избирателей;

созывает 21 сентября 2008 года заседание Политсовета ОДС для рассмотрения вопроса о прекращении дальнейшего участия Объединенных демократических сил в избирательной кампании.

Фото photo.bymedia.net

Еўрапейскі прарыў Сідорскага

Гістарычная падзея! Нарэшце адбыўся візіт высокага беларускага чыноўніка ў Еўропу. Калі дакладней, то ў аўторак прэм'ер-міністр Гедымінас Кіркілас і старшыня беларускага ўрада Сяргей Сідорскі сустрэліся на курорце Друскенінкай.

Паведамленні прэс-службаў вельмі кароткія: было абмеркавана супрацоўніцтва ў галіне энергетыкі, гандлю, інвестыцый... Але гэтая "сціпласць" не зніжае сапраўднай значнасці сустрэчы. Справа ў тым, што да гэтага дня, як падкрэслівае прэс-служба кіраўніка літоўскага ўрада, усе перамовы адбываліся на ўзроўні намеснікаў міністраў, візіты на вышэйшым узроўні не адбываліся досыць доўгі час. Адліга?..

Сышлі ў адпачынак

"Вертыкальшчыкі"-кандыдаты ў дэпутаты вымушаны пайсці ў адпачынак на час выбарчай кампаніі. Гэта робіцца для таго, каб яны не выкарысталі сваё службовае становішча ў мэтах агітацыі.

Як паведамляе ЦВК, у адпачынку апынуліся дзесяць старшыняў райвыканкамаў, два старшыні гарвыканкамаў і адзін старшыня аблвыканкама — віцебскі "губернатар" Уладзімір Андрэйчанка.

Санкции в обмен на выборы

США готовы при определенных условиях отменить ранее введенные экономические и политические санкции против Беларуси. Об этом заявил заместитель начальника пресс-службы госдепартамента США Роберт Вуд, сообщает ПРАЙМ-ТАСС.

Односторонние санкции администрации США в отношении Беларуси включили замораживание в 2006--2007 гг. активов Александра Лукашенко и ряда высших лиц белорусского правительства, а также блокирование американских счетов нефтехимического концерна "Белнефтехим" в ноябре 2007 года. Белорусскому руководству также запрещен въезд в Соединенные Штаты.

КАМЕРТОН

от Сергея Ваганова

Истерическая справедливость

Читатель Павел оставил на сайте "Народной воли" комментарий к моей прошлой публикации "Далеко от войны" ("НВ", №№121–122 от 15 августа): "Не верю", — цитирует он, — "межличностные отношения"... А историю почитать хотя бы в Википедии об отношениях Грузии и Осетии слабо?"

Читатель Павел, спасибо ему, подметил очевидную слабость публикации — отсутствие в ней упомянутой истории и, как следствие, глубокой аргументации в пользу той или иной воюющей стороны.

Об истории, как источнике политического вдохновения и победоносного достижения окончательной справедливости, печется не только читатель Павел. Вот и лидер абхазов Багапш, якобы убеждая (а то мучались в сомнениях!) депутатов российской Госдумы в необходимости признать абхазское государство, напомнил о том, что Грузия "девять раз нападала на Абхазию", и призвал к восстановлению "исторической справедливости".

У абхазов, наверное, есть основания не хотеть жить в грузинском государстве, особенно если посеяна ненависть. Еще больше, мне кажется, таких оснований у Багапша и властного абхазского клана — "О, море в Гаграх!.." и, разумеется, мандарины... Ну, а для нынешней российской власти оснований даже не надо придумывать — она уже не стесняясь проговаривается о наступившем "времени собирать камни" (Сергей Миронов, председатель Совета федерации)...

Но при чем здесь "историческая справедливость"? Как поместить в это безразмерное и в то же время прокрустово ложе триста тысяч грузинских беженцев? Что, изгнав их из Абхазии, разрушив их дома, ее власти построили для них дома в Грузии?.. Или хотя бы выплатили им компенсации, чтобы у политиков не возникал соблазн возвращать беженцев на танках, предварительно зачистив плацдарм с помощью установок "Град"? И при этом тоже толковать о справедливости и морали...

Нынешние события на Кавказе ярче даже (для нас, во всяком случае), чем события в Югославии, высветили одну из самых опасных традиций в сосуществовании народов и государств — традицию легализованного убийства, каковым является любая война. Традицию, от которой, казалось, навсегда отвратили кровавые катастрофы XX века.

Не отвратили. Мало того, она длится с новой ужасающей силой и в новом "цивилизованном" обличье, пытаясь представить себя миру воплощением высокой нравственности и добра. И самая циничная составляющая этого обмана — взывание к "исторической справедливости", переходящее в тяжелые формы шовинистического психоза и истерии. Когда я слышу, как политический деятель по фамилии Грызлов не просто сравнивает, а утверждает подобие "грузинской агрессии против Южной Осетии" с нападением фашистской Германии на Советский Союз, я понимаю, что за благообразной внешностью то ли дьякона, то ли светского льва скрывается циничный манипулятор чувствами миллионов сограждан, легко, напомню, согласившихся с "российской агрессией против Чечни". Или это называется по-другому?..

А чаепитие с ветеранами в качестве площадки для решительных угроз и напоминаний! Представляю, как ласкает слух россиянина заявление Медведева о "сокрушительном ответе", чему якобы подспорьем и доказательством служит победа на Курской дуге и в Великой Отечественной войне. А ведь казалось, что жертвы, в том числе сотни тысяч грузин, принесенные на алтарь этих побед, могут быть оправданы только новым миропорядком без войн...

Всякий раз, когда политики стенают об "исторической справедливости", ждите приказа на начало новой войны. И не ищите вслед за ними этой справедливости — ее в истории просто нет. Есть исторический опыт, который невозможно усвоить без исторической правды.

Этот опыт и эта правда просто вопиют против возрождения в России имперского духа, чему в немалой степени поспособствовало и то, как безрассудно подкинул хвороста в этот разгорающийся костер Саакашвили.

Читатель Павел скорее всего опять посчитает мои рассуждения оторванными от "истории отношений" и даже от жизни.

Но они и не о жизни — о смерти, о гибели тысяч людей. А за что? За "территориальную целостность", за "конституционный порядок"? Или за независимость? А может, за возможность беспрепятственно торговать контрабандным спиртом? Или за "великую Россию", которой почему-то тесно на "шестой части"?

Один из ответов на этот вопрос я нашел у автора РИА "Новости" Петра Романова, написавшего статью "Послевоенная истерия". Посмеявшись над той частью российского общества, которая обеспокоена ухудшением имиджа России и ее отношений с Западом, однофамилец российских самодержцев заключает: "Стоит ли в связи с прошедшими событиями пугаться милитаризации и ужесточения внутриполитического режима? Не стоит. Та бутафорская демократия, что мы имеем, выстоит: она и так не живая. Скорее наоборот, не исключено, что, избавившись, наконец, от призрака "оранжевой революции" (и у власти есть свои фобии), она может слегка и очеловечиться".

Вот так: чтобы "слегка очеловечиться", надо пострелять, побомбить, поубивать...

А потом назвать это "восстановлением исторической справедливости".

kamerton_41@mail.ru

ЧУЛІ?

Купляйце беларускае!

Міністэрства эканомікі Беларусі абмежавала памер гандлёвай надбаўкі пры фарміраванні цэн на імпартныя тавары.

Як паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на прэс-службу Мінэканомікі, новы парадак ужо зацверджаны суадноснай пастановай міністэрства, якая ўступіць у сілу праз 10 дзён пасля яе афіцыйнага апублікавання *(у аўторак дакладная дата апублікавання яшчэ не была вядома. —* **Аўт.**).

Пастановай удакладнены пералік расходаў, якія ўключаюцца імпарцёрамі пры фарміраванні адпускных цэн на тавары замежнага паходжання. Дакументам вызначана, што гранічны ўзровень гандлёвай і аптовай надбавак для імпартных тавараў павінен суадносіцца ўзроўню надбавак на тавары айчыннай вытворчасці.

Пастанова вызначае таксама, што гранічная надбаўка на імпартныя тавары дзеліцца па дамоўленасці бакоў на ўсіх юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі замежнага тавару, уключаючы імпарцёраў. Пры гэтым імпарцёры рэалізуюць тавары па адпускным кошце з забіраннем аптовай надбаўкі, узровень якой вызначаецца па дамоўленасці бакоў, зыходзячы з устаноўленых гранічных гандлёвых і аптовых надбавак. Памер гранічнай гандлёвай надбаўкі складае максімум 30 працэнтаў (пры рэалізацыі ў рознічнай сетцы і ў аб'ектах грамадскага харчавання) і 20 працэнтаў (пры рэалізацыі на іншыя мэты).

"Калі індывідуальныя прадпрымальнікі будуць пастаўлены ў такія ўмовы, то як эканамічныя адзінкі яны перастануць існаваць, — каментуе пастанову старшыня РГА "Перспектыва" Анатоль ШУМЧАНКА. — Таму што пры існуючых падатках і высокай арэндзе працаваць з гандлёвай надбаўкай усяго ў 30 працэнтаў будзе проста немагчыма. Калі ты абмяжоўваеш чалавека ў цэнаўтварэнні, то ты абмяжоўваеш яго ў вядзенні свайго бізнесу. Натуральна, такім чынам дзяржава хоча абараніць айчыннага таваравытворцу. Хоча, каб людзі куплялі толькі беларускія тавары, якія па якасці ў многім уступаюць сваім замежным аналагам. Але я не выключаю, што з такімі пастановамі і пры такім падыходзе да справы мы можам вярнуцца ў часы, калі модным было слова "фарцоўка". Пакупніка ж не падманеш. А прадпрымальнікі сабе ў страту таксама працаваць не будуць".

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

СУД!

За закрытыми дверями

В понедельник, 1 сентября, в редакцию "Народной воли" позвонила читательница и сообщила, что в Минском областном суде начали рассматривать очень интересное дело, одним из фигурантов которого является человек, о котором "Народная воля" не так давно писала — зять нынешнего председателя Комитета госконтроля Зенона Ломатя Олег Рощеня.

Фамилию зятя Ломатя в числе обвиняемых женщина увидела прямо на доске объявлений в здании суда (как известно, таким образом в белорусских судах информируют, где и какое заседание проходит, и в какой зал идти участвующим в процессе людям).

Как нам удалось выяснить, действительно, в понедельник в областном суде начался странный и закрытый судебный процесс. По делу проходит около 10 человек, которым будто бы инкриминируется незаконная предпринимательская деятельность: группа лиц через комиссионные магазины реализовывала военную технику. Большинство обвиняемых, неофициально сообщили нам, находятся за решеткой с декабря минувшего года.

Впрочем, в понедельник во второй половине дня неожиданно выяснилось, что один из главных фигурантов дела, главный свидетель обвинения, неожиданно подался в бега. Причем, если верить нашим источникам, все это время он, в отличие от своих коллег по несчастью, находился не в СИЗО, а под подпиской о невыезде. В результате... исчез. И 1 сентября было принято решение приостановить судебный процесс. То ли из-за того, что рассмотрение данного дела без беглеца невозможно, то ли еще по каким причинам, — нам, к сожалению, неизвестно...

Как удалось выяснить "Народной воле", засекреченным уголовным делом занимается судья **Анатолий Добродей**. Однако Анатолий Иванович отказался сообщить хоть какие-то подробности, в том числе, и о зяте Ломатя: *"Без комментариев. Дело секретное, потому что там есть государственные тайны. Все участники дали подписку о неразглашении"*.

"Народная воля" попыталась получить какую-то информацию о закрытом процессе у дочери председателя Комитета госконтроля Зенона Ломатя, муж которой, если верить нашей читательнице, проходит в процессе.

"Мне вся эта ваша информация неинтересна, и мне просто не о чем с вами разговаривать, — сказала Елена. — *Хотят люди говорить — пусть говорят..."*

Фото Антона ВИТАЛЬЕВА.

ДОСЬЕ

Что писали про зятя председателя КГК?

Вот что про зятя Зенона Ломатя в середине февраля этого года писал сайт "Белорусский партизан".

"...Для чиновников центрального аппарата КГК вот уже больше месяца не является тайной арест зятя главного контролера страны. В середине января в собственной квартире по подозрению в совершении преступления был задержан некто Олег Рощеня. Наши источники утверждают, что этот молодой человек -- муж одной из дочерей Зенона Кузьмича... Проводили "спецоперацию" не рядовые сотрудники МВД, а высокопоставленные чины КГБ...

Кстати, ранее Олег Рощеня трудился в спецподразделении МВД и имел непосредственное отношение к охране Александра Лукашенко..."

Эльмира САТАРОВА.

У 12 акругах выбіраць няма з каго

Парламенцкія выбары пройдуць на безальтэрнатыўнай аснове ў 12 выбарчых акругах.

Гэта Івацэвіцкая акруга №11, Пінская сельская №15, Наваполацкая №25, Рагачоўская № 45, Ваўкавыская №48, Мастоўская №56, Навагрудская №57, Смаргонская №59, Шчучынская №60, Барысаўская сельская №63, Маладзечанская сельская №71, Нясвіжская №72, дзе кандыдатамі зарэгістравана толькі па адным чалавеку. Амаль усе яны беспартыйныя, за выключэннем лідэра Камуністычнай партыі Беларусі дэпутата Палаты прадстаўнікоў Таццяны Голубевай.

Сярод кандыдатаў з безальтэрнатыўных акруг — начальнік упраўлення ЖКГ Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Міхасёў, старшыня Зэльвенскага райвыканкама Леанід Эльяшэвіч, першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Васіль Сцяпура, намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Марыя Бірукова, начальнік галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Сінякоў.

Яшчэ ў 53 выбарчых акругах кандыдатамі ў дэпутаты зарэгістравана па два чалавекі.

Народная Воля http://www.nv-online.info
4 ВЕРАСНЯ 2008 г.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Віталь КАРАТЫШ:

«Здымацца з выбараў я не збіраюся»

Незалежна ад таго, ці стане 24-гадовы Віталь Каратыш дэпутатам Палаты прадстаўнікоў, у найноўшую гісторыю Беларусі ягонае імя будзе запісана дакладна. Справа ў тым, што хлопец, які балатуецца ў дэпутаты ў Лунінцы, стаў першым у гісторыі прэтэндэнтам на дэпутацкі мандат, які непасрэдна ў ходзе выбарчай кампаніі быў прызваны ў войска...

— Аб тым, што я магу быць прызваны ў войска, я ведаў яшчэ да пачатку выбарчай кампаніі, — распачаў Віталь. — Праўда, падчас медыцынскай камісіі мне паведамілі, што я магу не трапіць у армію з-за праблем са здароўем. У мяне праблемы з сэрцам. Пасля таго, як я прайшоў медыцынскую камісію ў першы раз, паўстала пытанне аб маім камісаванні. Аднак камусьці вельмі хацелася адправіць мяне ў войска, і таму я быў накіраваны на дадатковае абследаванне...

— Тым не менш вы сталі збіраць дакументы на рэгістрацыю ўласнай ініцыятыўнай групы...

— Так. Даведаўшыся, што выбарчая камісія маю ініцыятыўную групу зарэгістравала, я пайшоў атрымліваць адпаведнае пасведчанне. Літаральна праз гадзіну пасля таго, як я атрымаў дазвол на збор подпісаў, мне патэлефанавалі з ваенкамата. У вайсковуцаў да мяне раптоўна ўзніклі нейкія "тэхнічныя" пытанні. І я падумаў, што пытанне аб маім камісаванні вырашана. Але высветлілася, што мяне забіраюць у войска...

Асабіста начальнік нашага Лунінецкага ваенкамата праводзіў мяне па кабінетах урачоў... Усё рабілася вельмі хутка. Праўда, не ўсе дактары адразу пагадзіліся паставіць свой подпіс пад маім накіраваннем у войска. Так, доктарка-кардыёлаг, ведаючы, што ў мяне праблемы з сэрцам, доўга ўпіралася... Але кампраміс быў знойдзены. Пасля таго, як мой абхадны ліст падпісала старшыня медыцынскай камісіі, здалася і яна. Мне паставілі трэцюю (самую "горшую") ступень прыгоднасці для службы ў арміі, і я адправіўся служыць...

— Чуў, што вас хацелі адправіць служыць у нейкую, ледзьве не сакрэтную часць, але ў самы апошні момант перанакіравалі... Чаму?

— Тут увогуле дзіўная гісторыя выйшла. Прадстаўнік адной з брыгад сакрэтнай сувязі хацеў забраць мяне з сабой. Селі. Пагутарылі. Па ступені адукаванасці я ім падыходзіў. Але, даведаўшыся, што я "фронтавец", ад маіх паслуг рэзка адмовіліся. Відаць, спужаліся, што я заваладаю нейкай сакрэтнай інфармацыяй... Начальнік ваенкамата ўпрошваў візіцёра забраць мяне, а той не пагадзіўся... Таму мяне і перанакіравалі.

Служу я пад Асіповічамі ў ракетнай брыгадзе №465. Служыць а нармальна, камандаванне ставіцца да мяне добра. Без праблем адпусцілі праводзіць агітацыю...

Шчыра кажучы, думаў, што будзе горш. Што да дзедаўчыны, то яе ў войску няма - проста выхоўваецца і замацоўваецца павага да старэйшых.

Рашэнне аб удзеле ў выбарах для мяне, канечне, свядомы выбар. Людзі хочуць перамен. Гэта адчувалася і падчас збору подпісаў, адчуваецца гэта і зараз. Выбаршчыкі, з якімі ўдаецца сустракацца, добра разумеюць сітуацыю, ім і тлумачыць асабліва нічога не трэба. Дарэчы, многія разумеюць і тое, з якой мэтай я быў тэрмінова прызваны ў армію...

— Віталь, мяркуючы па ўсім, вы збіраецеся ў гэтай выбарчай кампаніі прайсці да канца. У той жа час Сойм Партыі БНФ, сябрам якой вы з'яўляецеся, прыняў рашэнне аб знятці сваіх кандыдатаў...

— На Сойме я выступіў супраць таго, каб кандыдаты нашай партыі здымаліся з выбараў. На маю думку, такое непрадуманае рашэнне паставіць партыю ў смешнае становішча. Выбаршчыкі гэтага кроку не зразумеюць. Аргументы, якія гучалі ў адказ, мяне здзівілі. Ну вось, напрыклад: "Нам лепш знята, чым атрымаць 3—4% галасоў".

Але на сённяшні дзень я магу не падпарадкоўвацца партыйнаму рашэнню. Як гэта ні дзіўна, але ў гэтым мне дапамагла дзяржава. Справа ў тым, што вайсковцы тэрміновай службы па законе не могуць з'яўляцца сябрамі арганізацыі, якая пераследуе палітычныя мэты... Таму перад партыяй я "чысты". Свой шлях у гэтай выбарчай кампаніі я прайду да канца, здымацца не буду дакладна, бо лічу, што сёлетняя выбарчая кампанія дае, як ніколі, вялікі шанец трапіць у парламент...

Віталь ГАРБУЗАЎ.

КОРАТКА

Вацлаў Гавел выступіў за ўключэнне Беларусі і Украіны ў Еўрасаюз і НАТО

Па меркаванні экс-прэзідэнта Чэхіі Вацлава Гавела, Украіна і Беларусь адносяцца да еўраатлантычнай геаграфічнай і ментальнай прасторы і павінны стаць членамі ЕС і НАТО.

Аб гэтым Гавел заявіў у перадачы Чэшскага тэлебачання "Пытанні Вацлава Моравеца". Дарэчы, сярод пералічаных экс-прэзідэнтам дзяржаў не была згадана Грузія, якая сёння асабліва імкнецца ў НАТО.

Авіярэйсы з Тэль-Авіва ў Мінск могуць быць адменены

Штотыднёвыя авіярэйсы з Тэль-Авіва ў Мінск могуць быць адменены. Пра гэта заявіў генеральны дырэктар кампаніі "Эль-Аль" Хаім Рамана.

Паводле яго слоў, цяпер адбываецца "аптымізацыя" спісу месцаў, куды лятаюць авіялайнеры. Рэйс у Мінск не ўваходзіць у шэраг прыбытковых, а пасля імкліваго падаражання авіяцыйнага паліва стаў і зусім нявыгадным. Як паведамляецца, рэйсы ў Мінск і Санкт-Пецярбург могуць быць адменены з пачаткам зімовага сезона.

Настаўнікі засталіся без працы

Амаль паўсотні настаўнікаў у Барысаўскім раёне сталі беспрацоўнымі. Гэта здарылася пасля таго, як былі зачынены чатыры вясковыя школы.

Толькі 27 настаўнікаў атрымалі абяцанне, што іх працаўладкуюць ва ўстановах адукацыі Барысаўскага раёна. 16 чалавек звольнены па скарачэнні, а з 5 настаўнікамі не працягнулі працоўныя кантракты.

Ахвяры "ціхага палявання"

63 чалавекі атруціліся грыбамі ў Беларусі.

У Гродзенскай вобласці з чатырох пацярпелых аднаго чалавека выратаваць не ўдалося. Калі яго прывезлі ў Гродзенскую бальніцу хуткай дапамогі з цяжкім атручэннем, шансаў на яго выратаванне ўжо не было. І ўсё ж лекары змагаліся за яго жыццё на працягу двух дзён.

Медыкі сцвярджаюць, што прычынай падобных трагедый з'яўляецца запознены зварот пацярпелых па дапамогу.

У Мінску згуляюць маладзёжныя зборныя Расіі і Грузіі

Адборачны матч маладзёжнага чэмпіянату Еўропы па футболе паміж зборнымі Расіі і Грузіі адбудзецца ў Мінску на стадыёне "Трактар". Камісія УЕФА па надзвычайных сітуацыях прыняла рашэнне, улічваючы палітычную сітуацыю, перанесці яго правядзенне з Масквы.

Расіяне выбралі Мінск і атрымалі ў гэтым падтрымку Беларускай федэрацыі футбола.

Матч зборных Расіі і Грузіі адбудзецца 5 верасня, пачатак у 16 гадзін. Уваход на матч будзе вольны.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Елена БАБАРИКО:

«Правоохранительные органы позорят власть...»

На днях в редакцию "Народной воли" позвонила жена одного из задержанных сотрудников фирмы "Владпродимпорт" Елена Бабарико. До недавнего времени ее муж руководил Мозырским представительством данной фирмы. В начале августа он был задержан якобы по подозрению в причастности к организации взрыва, который раздался в Минске в ночь с 3 на 4 июля.

"Я хочу, чтобы вы написали о тех людях, которые сидят, — сказала Елена. —Пусть люди знают..."

— Моего мужа воспитывала одна мать, — говорит Елена. — В школе Геннадий учился на отлично. Занимался греблей, футболом, участвовал в различных олимпиадах, соревнованиях. После школы он сам, без посторонней помощи, поступил в элитное Минское военное высшее политическое училище. После училища его направили служить ва Украину. В 1992 году он отказался принимать украинскую присягу и перевелся в Мозырь. К тому времени мы уже поженились. Из Мозыря нас перевели служить в Кострому — фактически мы стали российскими гражданами. Муж служил в ракетных войсках. Мы скитались по гарнизонам, жили в казармах. Через некоторое время он уволился — в Мозыре у него живет мать. Он снова стал гражданином своей страны.

Потом он работал заместителем директора ЖКХ. Там он тоже был на хорошем счету. Он не пьет, не курит, всегда помогает людям...

Я это все вам рассказываю для того, чтобы вы просто знали, какие люди там сидят... Мой муж имеет три медали, у него нет ни одного взыскания — только благодарности. Его послужной список я послала следователю.

Кстати, муж сам поехал в Гомель — сказал, что его пригласили на беседу в правоохранительные органы. Это было примерно в семь часов вечера, я еще уговаривала его поехать утром, а не на ночь глядя... Но он, как законопослушный гражданин, все равно поехал... Оттуда его сразу же повезли в Минск. Это было 8 августа.

Недавно мне разрешили увидеться с мужем.

"Мне, нормальному человеку, прожившему 42 года, жить, вернее, существовать в таких условиях, как сейчас, очень неприятно, — сказал он мне. — Можно сказать, шоковая ситуация".

Говорит, что наговаривать на себя не будет, что ни в чем не виноват. И оговаривать других тоже не собирается, потому что это преступление. И по закону, и по совести. Рассказал, что в изоляторе временного содержания вначале сидел один. А в СИЗО на Володарского в камере вместе с ним находится 10 человек, а коек — всего восемь. Что некоторым приходится дежурить, пока остальные спят...

Следствие считает, что задержанные сотрудники фирмы по сговору с генеральным директором, по серым схемам, укрывали налоги. Но у мужа была не такая уж большая зарплата. Знаете, я думаю, что если бы мой муж воровал, то его бы мать не жила в доме барачного типа, а мы — не в старой хрущевке. И у меня дома был бы не скромный белорусский телевизор и не советская стенка...

И если все дело действительно в налогах, то почему расследованием занимается не Департамент финансовых расследований?

Всю свою жизнь мой муж чтил законы, служил и работал на благо своей страны, защищал родину. И я уверена, что у правоохранительных органов есть возможность изменить ему меру пресечения на подписку о невыезде. Он не собирается никуда убегать и верит в свою правоту и невиновность.

А еще я хочу попасть на прием к президенту и сказать ему, что правоохранительные органы просто его позорят. Возможно, Александр Григорьевич не знает, что творится за его спиной...

В ТЕМУ

Лариса СМИРНОВА: "Брат уверен, что его задержали по ошибке..."

На минувшей неделе родной сестре руководителя Брестского филиала фирмы "Владпродимпорт" разрешили свидание с братом. Лариса Смирнова - инвалид первой группы, она передвигается только на инвалидной коляске. В комнату свиданий ее заносили на руках...

Лариса Владимировна поделилась впечатлениями от встречи с братом-бизнесменом.

— Отвечу коротко: Олег держался и старался еще поддерживать меня, — рассказала Лариса Смирнова "Белорусскому партизану". — Говорили в основном о детях, о семье. Признает ли он свою вину? Я думаю, что однозначно нет. Потому что когда я спросила, что ему принести в следующий раз, он ответил: "Как в следующий раз? Я же, наверное, скоро выйду". Он вообще не считает себя виновным, говорит, что все делал правильно. Полагает, что произошла какая-то ошибка, и поэтому его задержали. Ошибка со стороны государственных органов, ошибка со стороны следователей...

Олегу 42 года, он женат вторым браком. Имеет двоих дочерей от первого брака, я на иждивении. Он человек терпеливый. В свое время закончил физкультурный факультет. Ну как он будет передо мной плакать? За эти пару недель он, конечно, заметно постарел, появились морщины, синяки под глазами...

У нас с Олегом был репрессирован дедушка-священник. Олега забрали точно так же, как забрали его: тихо, без объяснений. Домой он не вернулся. Мы даже до сих пор не знаем, где он похоронен... Но я думаю, что Олег все же вернется. Живым и здоровым...

ИЗ АРХИВА

В ночь с 3 на 4 июля в Минске сработало взрывное устройство, спрятанное в пакет из-под сока "Садочок". От взрыва пострадало около 60 человек, более 30 было доставлено в больницы.

Фирма "Владпродимпорт" занимается импортом продовольствия, в том числе и соков "Садочок". Сотрудники правоохранительных органов задержали более десяти сотрудников данной фирмы, в том числе генерального директора и бухгалтера. Первоначально подозревали в причастности к организации взрывов, теперь обвиняют в неуплате налогов.

"Владпродимпорт" работает на белорусском рынке более восьми лет. В фирме насчитывается более 400 сотрудников.

ОФИЦИАЛЬНО

«Владпродимпорт» подозревается в совершении экономических преступлений

Об этом, как сообщает сайт interfax.by, заявил министр внутренних дел Владимир Наумов.

"Предприятие "Владпродимпорт" подозревается в том, что совершило экономическое преступление", — сказал Наумов, отвечая на вопрос о ходе расследования уголовного дела о взрыве в Минске 4 июля. При этом министр пояснил, что в рамках расследования уголовного дела о взрыве были *"вскрыты другие преступления"*, среди которых и уголовное дело в отношении сотрудников данного предприятия.

"Мы уже проверили половину версий, и появилось еще больше уверенности, что это преступление будет раскрыто", — заявил Наумов.

Исполняющий обязанности начальника управления информации и общественных связей МВД Беларуси Олег Слепченко пояснил, что в ходе предварительного разбирательства в рамках расследования уголовного дела о взрыве в Минске было установлено, что *"партия сока, которую ищет следствие, была сбыта по "серым" схемам, через лжепредпринимательские структуры"*.

Ряду руководителей и сотрудников предприятия "Владпродимпорт" предъявлено обвинение по уголовной статье, предусматривающей ответственность за неуплату налогов.

ВМЕСТО КОММЕНТАРИЯ

Как сообщает президентская пресс-служба, А.Лукашенко потребовал раскрыть преступление, связанное со взрывом 4 июля в Минске.

"Отсутствие комплексного подхода в решении задач по обеспечению надежной безопасности массовых мероприятий сделало возможным и последнее чрезвычайное происшествие, произошедшее в ночь с 3 на 4 июля, — заявил Лукашенко. — *Данное преступление должно быть раскрыто"*.

Однако о каком раскрытии данного преступления можно говорить, если, не дожидаясь окончательных результатов расследования, были повышены в должностях те, кого, по идее, надо было привлечь хотя бы к дисциплинарной ответственности за взрыв? 29 августа А.Лукашенко назначил бывшего начальника ГУВД Минска **Анатолия Кулешова** заместителем министра внутренних дел — начальником милиции общественной безопасности, его бывшего заместителя-начальника милиции общественной безопасности **Александра Найденко** — начальником УВД Витебского облисполкома. Незадолго до этого пошел на повышение экс-председатель КГБ **Юрий Жадобин** — он стал госсекретарем Совета безопасности. Хотя этим людям после взрыва, коль не справились со своими обязанностями и не обеспечили безопасность простых граждан, пришедших на концерт, следовало бы по собственному желанию уйти из органов...

К слову, виновных в организации витебских взрывов, случившихся несколько лет назад, до сих пор не нашли. К сожалению, расследование дел о витебских и минских взрывах очень напоминает расследование дел о громких исчезновениях. Лукашенко уже почти десять лет требует найти убийц **Захаренко, Гончара, Красовского и Завадского**, но от этого ничего не меняется...

Марина КОКТЫШ.

СВОИМИ ГЛАЗАМИ

Регистрация кандидатов власти в Витебске проходила тайно?

Заседание окружной избирательной комиссии Витебского-Горьковского избирательного округа №17 началось на полчаса ранее назначенного срока. Комиссию собирали в авральном порядке. Пришло лишь девять человек из 13-ти. Заседание проводилось без зарегистрированных в комиссии наблюдателей и журналистов. Мое присутствие на нем стало просто случайностью — я явился за час до назначенного времени.

Причина аврала озвучена так и не была. Но поскольку рассматривали вопрос регистрации кандидатом в депутаты председателя Витебского городского Совета Геннадия Грицкевича, то можно догадаться, что поступила команда: кандидатов от власти регистрировать без лишних глаз и ушей.

"Тайную" регистрацию кандидатов от власти проводили и другие комиссии. В частности, комиссия по Витебскому-Чкаловскому избирательному округу №18. Ранее объявленного времени начала заседания, без независимых наблюдателей и журналистов зарегистрировала Виктора Овчинникова — главврача областной больницы. На заседании окружной комиссии №17 присутствовал представитель администрации Первомайского района (начальник отдела Шлюпаков), который своими подсказками, указаниями и напоминаниями неоднократно "помогал" заместителю председателя окружной комиссии, которая вела заседание.

Окружная комиссия №17, как накануне и 21-я, у ставленника власти выявила всего три недостоверные подписи (1,5 процента) из предоставленных 1288. Объявлено также, что протоколы выдвижения Грицкевича кандидатом в депутаты от трудовых коллективов оформлены грамотно. Правда, какие именно коллективы выдвигали председателя горсовета, на заседании комиссии не озвучивалось.

Документы о регистрации остальных претендентов комиссии рассматривали, как и положено, в объявленное время (после 45-минутного перерыва). И к этому времени уже подтянулись "недостающие" члены комиссии.

Зарегистрировали Татьяну Северинец — учительницу русского языка и литературы, мать известного общественного активиста Павла Северинца, изгнанную из школы по политическим мотивам. У нее выявили 11 недостоверных подписей (5,5 процента) из 1267 предоставленных в комиссию. Одновременно окружная комиссия, уже как кандидату в депутаты, объявила Татьяне Северинец предупреждение за недостоверные сведения об имуществе. Комиссия выявила в Брестской области недвижимость в виде 1/3 квартиры и 1/3 гаража, доставшиеся претендентке в наследство от отца. Хотя во владение данной собственностью Татьяна Северинец из этических соображений не вступила (мама еще жива), и потому в декларации не указала.

Комиссия отказала в регистрации безработной Елене Фоминой, которую выдвигали по так называемому "Европейскому списку". Причина отказа — выявлена 61 недостоверная подпись (17,4 процента) из 1063 предоставленных. Елену это обвинение очень возмутило. Дело в том, что 27 подписей (из 61 проверенных) она собрала лично. Хотя в комиссии каким-то образом оказались заявления избирателей, из которых следовало, что они за Фомину подписи не ставили и в глаза таковую не видели.

В этот же день избирательная комиссия по Витебскому-Чкаловскому избирательному округу №18 отказала в регистрации директору ЧУП Ирине Яцкевич. Отказала под предлогом недостоверно указанной должности: мол, претендентка — учредитель ЧУПа. По всей видимости, в составе комиссии нет грамотных юристов, ведь учредитель — это не должность. Учредитель может работать где и кем угодно. Полагаю, причина отказа кроется в неугодной властям активной политической деятельности предпринимательницы. Правда, на заседаниях комиссий политические мотивировки, как вы понимаете, не звучали.

Валерий ЩУКИН.

АТАМНЫ ПРАЕКТ

Што за спешка?

"Першая паля ў будаўніцтва АЭС у Беларусі можа быць забіта з 1 студзеня 2009 года, а можа быць, і раней", — заявіў на пасяджэнні калегіі Міністэрства энергетыкі першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка.

Ён нагадаў, што першы блок АЭС плануецца ўвесці ў эксплуатацыю ў 2016 годзе, другі — у 2018-м. "Яшчэ некалькі гадоў тому мы не маглі ад гэтым і марыць, а цяпер пачынаем рэалізоўваць такі праект", — зазначыў першы віцэ-прэм'ер.

Паводле слоў У.Сямашкі, у 2009 годзе бюджэтам прадугледжана выдзяліць на будаўніцтва атамнай электрастанцыі 200 млрд рублёў. Ён пранінфармаваў, што кошт будаўніцтва можа скласці 5—6 млрд долараў.

Наталля КАРОТКАЯ.

РЭГІЁН

У Пінску звольнілі даішніка, які замест штрафаў прадаваў латарэйныя білеты

За продаж латарэйных білетаў звольнілі супрацоўніка ДАІ ў Пінску. Замест таго, каб штрафаваць парушальнікаў, ён прымушаў іх купляць латарэйкі.

У маі Брэсцкі абласны выканкам выпусціў латарэю "За бяспеку", і яе распаўсюджваннем занялася абласная ДАІ. За дробныя парушэнні правілаў дарожнага руху даішнікі замест складання пратаколу прапаноўвалі кіроўцам набыць 10 латарэйных білетаў па 3 тысячы рублёў. Кіроўцы, зразумела, пачалі пісаць скаргі. Пасля службовага расследавання некалькі службоўцаў ДАІ былі прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці, а пінчука ўвогуле паказальна звольнілі за парушэнне службовай дысцыпліны.

Вось і выконвай пасля гэтага загады начальства!

Народная Воля http://www.nv-online.info
4 ВЕРАСНЯ 2008 г.

ОТ ПЕРВОГО ЛИЦА

Брюссель решил не ждать с моря погоды. Но то же советует и Минску

После того как на свободе оказались все, кого на Западе считали политическими заключенными, БелаПАН связался с начальником политического отдела генерального секретариата Совета ЕС Хельгой Шмид. Понимая важность наших вопросов, представительница Совета ЕС согласилась ответить на них, несмотря на то, что находилась в отпуске. С Хельгой Шмид мы беседовали о том, чего же ждать теперь от отношений между Минском и Брюсселем.

— Госпожа Шмид, освобождение политзаключенных было ключевым требованием Евросоюза. На какие шаги Брюсселя, кроме сделанных заявлений, можно рассчитывать? Могут ли отношения решительно улучшиться или быть серьезно пересмотрены?

— Сразу хочу отметить, что официальный Брюссель, в том числе мой начальник, Верховный представитель ЕС Хавьер Солана, тепло приветствовали освобождение всех политзаключенных в Беларуси. Это очень важный шаг.

Освобождение всех политзаключенных действительно было ключевым условием для начала расширения отношений с Беларусью. ЕС не раз напоминал, что заинтересован в диалоге с Беларусью, в налаживании с ней таких же отношений, как с другими странами региона — Украиной и Молдовой. Когда все политзаключенные на свободе, конечно, мы уже ближе к этому пути налаживания отношений с Беларусью.

Странам ЕС сейчас предстоит обсудить наш следующий шаг, мне не хотелось бы забегать вперед и говорить о том, что будет решено. Стоит отметить: Евросоюз последовательно указывал, что будет рассматривать освобождение политзаключенных как реальный шаг белорусских властей в направлении уважения основных европейских ценностей — демократии, прав человека и верховенства закона.

Брюссель подчеркивал, что это даст возможность пересмотреть ограничительные меры в отношении отдельных белорусских чиновников и позволит ЕС постепенно возобновить отношения с Беларусью после последующих положительных шагов со стороны официального Минска.

В этом контексте хотелось бы отметить особую важность того, как будут проведены парламентские выборы, назначенные на 28 сентября. Если они пройдут лучше, чем предыдущие избирательные кампании в Беларуси, это придаст новый импульс развитию наших отношений.

— Не было ли освобождение политзаключенных своего рода компромиссом между ЕС и Беларусью? Что мог обещать Брюссель в ответ на этот шаг белорусских властей?

— Наша позиция в вопросе о политзаключенных хорошо известна нашим белорусским коллегам. Я считаю, что интерес в расширении белорусско-европейских отношений взаимен. Кроме того, у Евросоюза и Беларуси есть общие интересы. Однако у нашего сообщества ценностей был и остается определенный набор условий, основанных на этих ценностях, которые необходимы для делового сотрудничества. Об этом мы и говорили с Минском, не было никаких закулисных интриг или сделок.

— На следующий день после того, как на свободе оказались все политзаключенные, в Минск для переговоров с властями и оппозицией прилетел представитель Госдепа США Дэвид Меркел. Можно ли в ближайшее время ожидать визита к нам представителя Брюсселя с теми же целями?

— В принципе, последние полтора года представители Брюсселя находятся в постоянном контакте с белорусскими властями. С марта 2007 года я три раза лично приезжала в Беларусь на переговоры с представителями как правительства, так и гражданского общества. Кроме того, полезные встречи прошли и в Брюсселе. Надеюсь, что эти контакты будут расширяться и укрепляться. Уверена, что обмен визитами продолжится. Для Евросоюза очень важно продолжить и укрепить диалог.

— В июле состоялась встреча премьер-министров Беларуси и Латвии, несмотря на то, что контакты такого уровня с белорусскими представителями Брюсселем запрещены. Официальная Рига объяснила необходимость этих переговоров экономическими интересами страны и ее граждан. Как ЕС относится к этой ситуации?

— Действительно, существует запрет относительно встреч на так называемом политическом уровне между представителями стран ЕС и Беларуси. Но мы все же понимаем, что в вопросах развития трансграничных связей без подобных встреч не обойтись. Латвия граничит с Беларусью и ей нужно обсуждать вопросы трансграничного сотрудничества со своим соседом.

— Будет ли ЕС ждать выполнения всех 12 рекомендаций стратегии для расширения взаимодействия с Беларусью?

— Опять же — неоднократно повторялось, в том числе Верховным представителем Хавьером Соланой, что никто не рассчитывает на чудесное выполнение всех рекомендаций сразу. Мы рассчитываем увидеть последовательное движение к демократизации, верховенству закона и уважению прав человека. Мы должны рассматривать расширение наших отношений как процесс.

Как я уже говорила, ЕС готов к развитию диалога с Беларусью, который зависит от последующих положительных шагов белорусских властей. Подобный подход предполагает, что мы не будем ждать, пока все станет идеальным — мы будем эволюционно развивать и расширять наши отношения.

Марина РАХЛЕЙ, БелаПАН.

Былыя беларускія палітзняволеныя патрабуюць сваёй поўнай рэабілітацыі

Андрэй Кім, Сяргей Парсюкевіч і Аляксандр Казулін патрабуюць поўнай сваёй рэабілітацыі. Пра гэта гаворыцца ў сумеснай заяве былых вязняў, распаўсюджанай 25 жніўня.

— Мы рады апынуцца на волі, але наша сапраўднае вызваленне яшчэ не наступіла. Мы прымаем наша вызваленне як фактар справядлівасці, але ніколі не прызнавалі сябе вінаватымі і лічым, што былі асуджаны незаконна па палітычных матывах, — гаворыцца ў заяве.

Пры гэтым, як зазначаецца ў дакуменце, "яшчэ рана гаварыць аб тым, што ў Беларусі больш няма палітзняволеных".

— 10 нашых таварышаў: Аляксей Бондар, Арцём Дубскі, Міхаіл Крываў, Міхаіл Пашкевіч, Аляксандр Стральцоў, Аляксандр Чарнышоў, Таццяна Цішкевіч, Міхаіл Субач, Павел Вінаградаў, Максім Дашук — удзельнікі зімовых акцый пратэсту прадпрымальнікаў — прыгавораны да розных тэрмінаў абмежавання волі. Без дазволу міліцыі ім можна знаходзіцца толькі дома і па месцы працы. Ім забаронена выязджаць за мяжу, а са свайго горада яны могуць выехаць толькі па дазволу ўлад, пасля 19 гадзін яны абавязаны знаходзіцца па месцы рэгістрацыі. За малейшае парушэнне гэтага рэжыму іх у любы момант могуць кінуць за краты. Мы лічым, што гэтыя людзі таксама знаходзяцца ў статусе палітзняволеных, — гаворыцца ў заяве.

Таксама былыя палітзняволеныя заяўляюць, што выбарчая кампанія, што праходзіць у краіне, не з'яўляецца сумленнай і адкрытай. "Як можна аб гэтым гаварыць, калі і мы, і іншыя лідэры апазіцыі — Міхаіл Марыніч, Мікалай Статкевіч, Павел Севярынец, Артур Фінькевіч, Дзмітрый Дашкевіч, Мікалай Аўтуховіч, Андрэй Клімаў, а таксама многія іншыя беларускія вязні сумлення абмежаваныя ў правах і не могуць удзельнічаць у выбарах у якасці кандыдатаў. Без поўнага аднаўлення правоў палітзняволеных нельга гаварыць, што выканана адна з 12 прапаноў Еўрапейскага Саюза па дэмакратызацыі Беларусі", — лічаць А.Казулін, А.Кім і С.Парсюкевіч.

— Мы цвёрда перакананыя, што вызваленне некалькіх палітзняволеных сёння — гэта не гарантыя таго, што заўтра на іх месцы не апынуцца іншыя. Неабходна дабівацца інстытуцыянальных змен у беларускім заканадаўстве, рэальнага раздзялення судовай і выканаўчай улад, поўнай рэабілітацыі палітзняволеных і прадухілення падобнай практыкі ў будучыні, — зазначаюць былыя палітзняволеныя.

Палітзняволеных — няма, палітрэпрэсаваныя — ёсць

Праваабарончае грамадскае аб`яднанне "Беларускі Хельсінкскі камітэт" (БХК) заклікае беларускія судовыя органы перагледзець прыгавор па "справе 14".

Пра гэта гаворыцца ў адпаведнай заяве БХК.

"У нашай краіне больш няма палітзняволеных, але, на жаль, застаюцца палітрэпрэсаваныя", — гаворыцца ў заяве арганізацыі.

Нагадваецца, што Аляксей Бондар, Арцём Дубскі, Міхаіл Крываў, Міхаіл Пашкевіч, Аляксандр Стральцоў, Аляксандр Чарнышоў, Таццяна Цішкевіч, Міхаіл Субач і Павел Вінаградаў прыгавораны да абмежавання волі на два гады без накіравання для адбывання пакарання ў папраўчых установах. Антона Койпіша і Уладзіміра Сяргеева аштрафавалі на 100 базавых велічынь, Максім Дашук, як непаўналетні, прыгавораны да паўтара года абмежавання волі. Яны былі асуджаны за ўдзел у акцыі пратэсту прадпрымальнікаў у студзені 2008 года.

Беларускі Хельсінкскі камітэт лічыць, што крымінальны пераслед і санкцыі, прыменены да фігурантаў "справы 14-ці", яўна несуразмерныя ўчыненым дзеянням і іх наступствам. Поруч з ходам папярэдняга расследавання і судовага разбору гэта сведчыць аб палітычнай матывацыі вынесенага прыгавору.

"Асноўнай прычынай падобнага роду разбораў з`яўляецца недасканаласць беларускага заканадаўства аб масавых мерапрыемствах, якое супярэчыць Канстытуцыі краіны і міжнародным абавязацельствам, а таксама рэпрэсіўны характар крымінальнага заканадаўства ў гэтай частцы", — лічыць БХК.

Таксама БХК чарговы раз звяртае ўвагу на неканстытуцыйнасць арт. 193-1 Крымінальнага кодэкса. На думку праваабаронцаў, наяўнасць гэтага артыкула супярэчыць Канстытуцыі, якая абвяшчае свабоду асацыяцый. "Артыкул 193-1 дазваляе прымаць крымінальныя санкцыі супраць самаарганізаваных людзей, чыя дзейнасць не накіравана на прычыненне ўрону дзяржаўнай або грамадскай бяспекі, парушэнне грамадскага парадку або парушэнне правоў і свабод іншых асобаў", — лічаць праваабаронцы.

Камітэт заклікае беларускія ўлады прывесці нацыянальнае заканадаўства і практыку яго прымянення ў адпаведнасць з Канстытуцыяй і ўзятымі на сябе міжнароднымі абавязацельствамі для забеспячэння грамадзянам магчымасці рэалізоўваць свае правы.

ГУЧНАЯ СПРАВА

З ног на галаву,

альбо Як Брэсцкая міжгарнізонная вайсковая пракуратура трактуе "прафілактычную гутарку" начальніка Кобрынскага КДБ Андрэя Басько з інжынерам мясцовага ўпраўлення магістральных газаправодаў Аляксандрам Мехам

Нагадаем, падставай для звароту ў органы беларускага правасуддзя для былога інжынера Кобрынскага ўпраўлення магістральных газаправодаў Аляксандра Меха стала ягонае звальненне з працы. "Народная воля" неаднаразова паведамляла, што непрыемнасці для Меха распачаліся пасля "нефармальнай гутаркі" ў кабінеце начальніка прадпрыемства Уладзіміра Галашкі. "Выхавальную" размову ў гэтым самым кабінеце з Мехам, акрамя Галашкі, праводзіў начальнік Кобрынскага КДБ спадар Басько. Яе сэнс палягаў у наступным: Меху было прапанавана ўзважыць мэтазгоднасць уласнага ўдзелу ў выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў. Калі казаць проста — у выпадку вылучэння на выбары Аляксандру Меху пагражалі стратай месца працы.

Гэта ў рэшце рэшт і адбылося. Аляксандр Мех з пасады інжынера Кобрынскага ўпраўлення магістральных газаправодаў быў звольнены. Не дапамагло і судовае разбіральніцтва, пра якое "Народная воля" падрабязна пісала ў мінулых нумарах. Суддзя Аляксандр Бабаскін палічыў звальненне Меха законным. З прыгавору суда вынікае, што Меха пазбавілі працы законна, згодна з працоўным заканадаўствам. І ніякай палітыкай тут увогуле не патыхае...

Тым не менш Мех працягвае настойваць на сваім: маўляў, ягонае звальненне — гэта чыстая палітыка. Ён лічыць, што прадстаўнік Кобрынскага КДБ Басько спрабаваў перашкодзіць яму абірацца і быць абраным. Адпаведную заяву Мех накіраваў у Брэсцкую міжгарнізонную пракуратуру. Ён патрабаваў узбудзіць крымінальную справу супраць Басько.



Праўда, атрыманы з пракуратуры адказ не стаў сенсацыйным. У дзеяннях Басько, на думку старшага памочніка Брэсцкага міжгарнізоннага вайсковага пракурора маёра юстыцыі спадара Дымшы, няма ніякага складу злачынства.

Думаецца, не мае сэнсу цытаваць атрыманы Мехам дакумент цалкам, засяродзімся толькі на асобных фактах, якія пры праверцы ўстанавіў пракурорскі работнік: *"У ходзе праверкі ўстаноўлена, што 4.06.2008 у кабінеце Галашкі сапраўды адбылася вышэйзгаданая размова. Яна насіла выключна прафілактычны характар і была накіравана на папярэджанне з боку Меха магчымых правапарушэнняў. Падставай для правядзення гэтай размовы паслужыў факт прыцягнення Меха да адміністрацыйнай адказнасці за распаўсюджванне друкаваных выданняў, выробленых з парушэннем ўстаноўленага парадку, якія не маюць выходных дадзеных, змест якіх накіраваны на прычыненне ўрону дзяржаўнаму і грамадскаму парадку, правам і законным інтарэсам грамадзян".*

Средневековые хроники повествуют о том, что в 1636 году король Людвиг Баварский приговорил к смертной казни некоего Дица фон Шаунбурга с четырьмя его ландскнехтами за то, что они подняли восстание. Когда приговоренных привели на место казни, согласно рыцарской традиции, Людвиг Баварский спросил у Дица, каково будет его последнее желание. К величайшему удивлению короля, тот попросил поставить их всех в один ряд на расстоянии восьми шагов друг от друга и отрубить голову ему первому. Он пообещал, что начнет бежать без головы мимо своих ландскнехтов, причем те, мимо которых он успеет пробежать, должны быть помилованы.

Диц выстроил своих товарищей в ряд, а сам встал с краю, опустился на колени и положил голову на плаху. Но как только ударом топора палач снес ее, Диц вскочил на ноги и помчался мимо застывших в ужасе ландскнехтов. Только пробежав мимо последнего из них, он замертво упал на землю. Потрясенный король выполнил свое обещание и помиловал ландскнехтов.

Обнаружено удивительное свойство лука

Новое и удивительное качество репчатого лука обнаружили японские ученые. Выяснилось, что он способен "очищать" клетки головного мозга и задерживать процесс их старения.

Как оказалось, лук содержит исключительно активные серные соединения, которые легко усваиваются организмом. Попадая в кровь, они оказывают самое позитивное воздействие на ряд ключевых зон головного мозга. Так, выделяющиеся из лука вещества активизируют и омолаживают клетки, отвечающие за память и эмоции.

В прошлом году были представлены результаты работы французских ученых. Исследования проводились среди женщин северо-восточной Франции. Выяснилось, что употребление в пищу чеснока и лука ведет к снижению заболеваемости раком груди.

Народная Воля http://www.nv-online.info
4 ВЕРАСНЯ 2008 г.

ОФИЦИАЛЬНО

Василий ЖАРКО, министр здравоохранения:

«Мы вносим предложение об увеличении срока распределения выпускников медвузов»

28 августа на сайте информационного агентства БЕЛТА состоялась online-конференция министра здравоохранения Беларуси Василия ЖАРКО. Мы решили ознакомить наших читателей с наиболее актуальными и интересными, на наш взгляд, вопросами и ответами министра.

— Слышал, что сложнейшие офтальмологические операции теперь сможет проводить Республиканский центр микрохирургии глаза. Смогут ли государственные клиники, в которых проводятся операции на глазах, конкурировать с негосударственными по спектру и уровню оказания услуг?

Василий Жарко: — В настоящее время Республиканский центр микрохирургии глаза на базе 10-й Городской клинической больницы г. Минска и другие государственные офтальмологические клиники оснащены самым современным диагностическим оборудованием и оборудованием для выполнения оперативных вмешательств. Спектр и качество оборудования, подготовка врачей-специалистов в этих учреждениях позволяют выполнять весь возможный перечень современных высокотехнологичных операций, кроме эксимерных лазерных операций на роговице. Внедрение данной технологии планируется в текущем году.

— Появится ли в Беларуси административная ответственность за ложный вызов "скорой"?

— Для сотрудников скорой медицинской помощи количество безрезультатных вызовов является огромной проблемой — "скорая" приезжает, а адрес вызывающего пациента не найден или не найден сам пациент. Количество ложных вызовов, например, в Минском районе составляет 2,7 % от общего количества обращений за помощью в "скорую", в Гомеле — 0,8 %. В столице в прошлом году количество безрезультатных вызовов превысило 8,5 тыс., 96 вызовов оказались "шуткой". Но вопрос о юридической ответственности за ложный вызов "скорой" пока не решен.

— Пока в Беларуси пересаживают костный мозг, почки и печень, в планах — первая пересадка сердца. Как скоро трансплантологи возьмутся за обещанную пересадку поджелудочной железы, много ли нуждающихся в такой операции в стране?

— Операция по трансплантации поджелудочной железы планируется на 2009 год. В ней нуждаются больные с сахарным диабетом в сочетании с терминальной почечной недостаточностью. Как правило, пересадка поджелудочной железы проводится одновременно с трансплантацией почки.

— Почему недавнее увеличение заработной платы коснулось только некоторых категорий врачей? А другие что — специалисты второго сорта?

— Минздрав постоянно вносит предложения по совершенствованию и увеличению оплаты труда медицинских работников. В связи с увеличением объема амбулаторно-поликлинической помощи населению правительство приняло решение в первоочередном порядке повысить оплату труда врачам амбулаторно-поликлинического звена (кроме врачей-терапевтов, педиатров-участковых и врачей общей практики, которым в соответствии с постановлением Министерства труда и социальной защиты от 18 февраля 2005 года №14 устанавливаются надбавки за счет дополнительно планируемых 40% фонда оплаты труда этих работников) и врачам стационаров. Министерство здравоохранения продолжает разрабатывать предложения по увеличению уровня оплаты труда всех медицинских работников — врачей, среднего и младшего персонала.

— Моя дочь намерена поступать в Белорусский государственный медицинский университет на специальность "лечебное дело". Планируется ли в следующем году дальнейшее увеличение набора на медицинские специальности в БГМУ и другие медицинские вузы?

— Да, планируется. В высшие медицинские учреждения образования за счет средств республиканского бюджета в 2009 году планируется принять 2,7 тыс. абитуриентов (в нынешнем году — 2 тыс. 130), на условиях оплаты — в рамках предельной численности обучающихся, предусмотренной специальным разрешением (лицензией) на образовательную деятельность каждого из медицинских университетов.

— Слышала, что у участковых врачей теперь появятся помощники, которые будут выписывать рецепты и выполнять часть других обязанностей врача. Хочу поинтересоваться, будут ли помощники проходить специальную медподготовку "с нуля" в учебных заведениях, или новые функции будут выполнять медсестры, которых переквалифицируют? Я сама медсестра, хочу воспользоваться такой возможностью.

— Повышение уровня образования и профессиональной подготовки средних медработников, изменения структуры заболеваемости и доминирующих социальных установок потребовали расширения функций кадрового состава первичной помощи и повышения роли среднего медицинского персонала. Постановлением Министерства здравоохранения Республики Беларусь от 7 марта 2008 года №48 введена должность помощника врача по амбулаторно-поликлинической помощи. Право на переподготовку будет предоставлено фельдшерам и медицинским сестрам с высшим медицинским образованием.

— В Москве молодым парам, не имеющим детей, предоставляется право на проведение двух бесплатных процедур ЭКО. Будет ли когда-нибудь такая возможность у белорусов? Может, прогнозируется хотя бы снижение стоимости этой процедуры? У молодой семьи нет возможности платить 4 тыс. долларов за ЭКО...

— По поводу достоверности ваших слов о том, что в Москве два цикла ЭКО проводят бесплатно, у меня большие сомнения. В Беларуси стоимость данной процедуры, включая медикаменты, — около 4 млн белорусских рублей, а в Москве это обходится в 4 тыс. долларов. Бесплатно ЭКО не делают ни в России, ни в Беларуси. Рассматривается вопрос кредитования бесплодных пар, чтобы они имели возможность провести платный цикл ЭКО. Такие предложения внесены Минздравом.

— Ходят слухи о возможном распределении студентов медицинских вузов на 5—10 лет? Коснется ли это лиц с внебюджетной формой обучения?

— Сейчас еще рано говорить о пяти или более годах. На сегодняшний день у нас обязательная отработка — три года с учетом интернатуры. Но мы вносим предложение, с целью закрепления кадров на местах, об увеличении срока.

— Можно ли надеяться, что в перспективе гражданам будет предоставлено право выбрать врача?

— Такое право гражданин имеет и в настоящее время. Нужно написать заявление на имя главного врача о желании обслуживаться у того или иного специалиста. Место проживания человека значения не имеет. Руководитель медицинского учреждения принимает окончательное решение, учитывая в том числе и загруженность данного специалиста.

— Почему в государственных медицинских организациях могут работать врачи без категорий или с 3-й категорией, а в частных нет? Многие молодые доктора недовольны зарплатой в госструктурах и, не имея возможности трудоустроиться в частную клинику, оставляют профессию. Кроме того, частники вынуждены "переманивать" врачей с высшей и первой категориями. Что же остается государственным поликлиникам и больницам?

— В государственных поликлиниках и больницах работают врачи и с высшей, и с первой, и с другими категориями. В негосударственной медицинской сети введены такие квалификационные требования, чтобы помощь оказывалась более качественно и профессионально.

ВМЕСТО КОММЕНТАРИЯ

Получается рабство какое-то...

Безусловно, что многие ответы Василия Жарко заслуживают отдельного комментария. Например, стоимость операции ЭКО. В Беларуси действительно уже более 10 лет практикуются услуги по искусственному оплодотворению, но только на платной основе. В нашей стране, объявившей о демографической программе, почему-то не внедряется практика высокоразвитых европейских стран, где любая работающая женщина имеет право на три бесплатные попытки ЭКО. Не перенимаем мы и опыт наших соседей: в Литве, Латвии, Польше при любой попытке искусственного оплодотворения пациенты оплачивают лишь половину стоимости операции.

Но, пожалуй, самым обсуждаемым ответом министра стало заявление о том, что Минздрав внес предложение об увеличении срока отработки выпускников медвузов по распределению.

Многие расценили эти слова как уже практически решенный вопрос. Ибо чуть более месяца назад, во время посещения витебского роддома, аналогичное заявление прозвучало из уст Александра Лукашенко. "У врача в руках слишком дорогое — здоровье и жизнь людей, и шутить с этим нельзя. Поэтому всякие меры будем принимать. Мы тебя обучили — иди, отработай на государство, и не год-два... 10—15 лет", — сказал тогда глава государства.

Стоит отметить, что проблему дефицита медицинских (и не только) кадров государство уже несколько лет решает по-советски: в стране введено жесткое обязательное распределение. Выпускников, которые не являются по месту распределения, обязывают через суд вернуть затраченные на их учебу средства.

Причем зачастую эта сумма превышает стоимость обучения на платных отделениях. Хотя случаются и исключения. Например, от обязательного распределения в прошлом году освободили выпускницу Лингвистического университета Марину Федорук, ей разрешили поступить в магистратуру. На выпускном балу во Дворце республики девушка танцевала с Александром Лукашенко... Не поехала отрабатывать "барщину" и певица Аня Шаркунова. Получив диплом педагога, девушка не поспешила куда-нибудь в глубинку учить детей. Ей разрешили остаться в Минске, петь в милицейском ансамбле...

Решит ли дефицит медицинских кадров обязательное распределение на 5, 10 лет? Или наоборот - подобное нововведение отобьет охоту у молодых людей учиться на врача и тем самым вопрос нехватки медиков встанет еще острее? Да и вообще, имеет ли право государство вводить "крепостное право", не является ли это элементарным нарушением прав человека? Эти вопросы мы адресовали врачам, юристам и обычным белорусам.

Светлана ЗИГАНШИНА, педиатр Любанской районной больницы:

— На мой взгляд, удержать ребят на районе может только жилье и достойная зарплата. Причем сегодня даже зарплата - это не самое главное. В принципе, молодым специалистам предлагают подработки, дают надбавки, и они получают практически столько, сколько и врачи со стажем. Но где им жить?!

В этом году в наш район по распределению приехало около 10 молодых специалистов, и ни один не получил даже комнаты в общежитии. Ребята вынуждены искать угол, а на это нужны деньги. Несколько молодых специалистов уже отработали по распределению и тут же уехали! Уехали все! Терапевт хотел остаться, но уехал именно потому, что нет жилья, полставки у него забрали. Уезжают в Минск, Минск, в Молодечно - чаще туда, откуда родом. В Петербург уехал анестезиолог, сейчас хирург собирается тоже в Россию перебраться.

Возможно, распределяя студентов, должны учитывать место проживания их родителей. Или сразу же предоставлять молодым специалистам жилье. Хотя и это неправильно. Получается рабство какое-то! Молодым людям просто будут ломать судьбы, ведь 10 лет - это не три года.

Игорь БРОВКО, начальник Управления организации медицинской помощи Минздрава:

— Решать вопрос дефицита кадров мы просто обязаны. В некоторых районах до 50 процентов врачебных ставок не укомплектованы. Прорабатываются разные варианты решения этой проблемы. Например, каждый год мы увеличиваем наборы студентов в медвузы страны. Что касается распределения, то, на мой взгляд, увеличивать срок отработки надо, но дифференцированно. Мое мнение такое: выпускников бюджетных отделений распределять на три года + интернатура, тех, кто поступал по целевым направлениям - тут можно говорить и о 5, и о 10 годах. Если не могут трудоустроиться выпускники платных отделений и просят помочь, то и они должны распределяться по единым для всех правилам.

Игорь ПОЛЕЩУК, инженер, отец выпускницы БГМУ:

— Моя старшая дочь окончила Минский медуниверситет в 2006 году. Первый курс она училась на платном отделении, потом, сдав все экзамены на пятерки, была переведена на бюджетную форму обучения. Будучи студенткой, вышла замуж за гражданина Кипра.

Когда пришло время распределения, в ректорате, правда, в устной форме, ей сказали, что, конечно же, она может проходить интернатуру по месту жительства мужа. Так она и сделала, и все было нормально до прошлого года. Летом 2007 года мы получили извещение, что дочь обязана вернуть медуниверситету 23,5 миллиона рублей за обучение. У нас таких денег не было, дочь находилась на Кипре. В сентябре состоялся суд и судебный исполнитель стал требовать возмещения денег, дочь разыскивала милиция, нам было сказано, что если дочь приедет в гости, то покинуть территорию Беларуси не сможет, так как против нее было возбуждено дело, и она не рассчиталась с государством.

Удивительно, но на Кипре дочери Министерство здравоохранения этой страны предоставило возможность бесплатно пройти интернатуру. Потом она была направлена на работу в республиканский онкоцентр в Никосии. В клинике работает интернациональная бригада врачей: есть врачи из Латвии, США, Новой Зеландии, Австралии. И никто не верит в то, что в Беларуси существует обязательное распределение. Они даже понять не могут, как такое может быть.

Дочь вернула 25 миллионов государству (с учетом судебных издержек). Осадок, конечно, остался. И получилось несправедливо. Например, подруга дочери тоже не поехала по распределению. Она родила ребенка, ей позволили остаться с мужем. Почему мою дочь кто-то хотел лишить права жить с мужем? Ведь по сути получилось как: ее желание жить с мужем стоило ей 25 миллионов рублей.

Не знаю, как девушки, но ребят, думаю, подобное нововведение может остановить от поступления в медуниверситет. Если девушки могут выкрутиться и найти лазейки: выйти замуж, родить ребенка, то парням ехать по распределению придется. И не каждый будет готов сидеть в сельской больнице за копейки.

Гарри ПОГОНЯЙЛО, председатель юридической комиссии РПОО "Белорусский Хельсинкский комитет":

— БХК оценивает ситуацию с распределением студентов как использование принудительного труда, которое запрещено международными конвенциями, белорусским трудовым законодательством и Конституцией Беларуси. По сути распределение отменяет бесплатное образование, которое тоже гарантировано белорусам Основным законом страны. С этим надо бороться всем миром. БХК свое заключение в уставном порядке представил в Международную организацию труда, чтобы международные эксперты расследовали случаи использования принудительного труда в Беларуси. К слову, мы писали и о распределении студентов, и о случаях принудительного труда в армии, ЛТП и т.д. Ответа пока не получили.

Свое заключение БХК направил также в Совет министров Беларуси, в Администрацию президента, во все заинтересованные министерства и ведомства. Получили ответы: принудительный труд у нас нигде не используется. Дважды мы писали в Конституционный суд с тем, чтобы он принял определенные решения. Но Конституционный суд уклонился от рассмотрения наших обращений.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

Мараторый на пісанне падручнікаў

Мінадукацыі ўявло мараторый на спісанне падручнікаў, паведаміў намеснік міністра Казімір Фарыно. Ён падкрэсліў, што спісваць не будуць "нават падручнікі савецкага перыяду".

Адначасова спадар Фарыно заявіў, што ў гэтым годзе выдаздзена вялікая колькасць літаратуры, і "ў школах яна ёсць, трэба толькі знайсці аптымальны варыянт яе размеркавання". "Павінен быць ажыццёўлены кантроль за выкарыстаннем усёй вучэбнай літаратуры. У выпадку неабходнасці перараэмеркаванне вучэбнай літаратуры павінна адбыцца паміж школамі, раёнамі, абласцямі", — сказаў намеснік міністра. Такім чынам, Мінадукацыі ўсё ж такі прагназуе дэфіцыт падручнікаў.

Дарэчы, паводле слоў К.Фарыно, кошт карыстання камплектамі падручнікаў у гэтым годзе складзе ад 7 да 22 тысяч рублёў. Цана залежыць ад года выдання кнігі і класа, у якім вучыцца дзіця. Новыя падручнікі і карыстанне імі будуць каштаваць больш.

Алена СПАСЮК.

У Беларусі кожны пяцідзесяты — наркаман

Па неафіцыйных звестках у Беларусі налічваецца да 200.000 наркаманаў.

Рэальна на ўліку знаходзіцца больш за 13 тыс. наркаманаў і таксікаманаў. Прыблізна 3 тыс. праходзяць прымусовае лячэнне.

За апошнія 10 гадоў колькасць нарказалежных у краіне павялічылася ў тры разы і цяпер складае 130 чалавек на 100 тыс. насельніцтва. Такія лічбы на прэс-канферэнцыі 28 жніўня абнародаваў начальнік аддзела па нагляддзе за следствам Генеральнай пракуратуры Уладзімір Марцаль.

Паводле ягоных слоў, штогод у Беларусі ўчыняецца 4—6 тыс. злачынстваў, звязаных з незаконным абаротам наркотыкаў. За шэсць месяцаў 2008 года за злачынствы, звязаныя з абаротам наркотыкаў, распачата 1018 крымінальных спраў у дачыненні да 1187 абвінавачаных.

Пабывалі ў рабстве? Адгукніцеся!

Аддзелам па расследаванні злачынстваў у сферы арганізаванай злачыннасці і карупцыі ўпраўлення папярэдняга расследавання УУС Гомельскага аблвыканкама распачата справа па прыкметах злачынства ч.2 арт.181 КК (гандаль людзьмі).

Затрыманыя два жыхары Гомельскай вобласці, якія падманным шляхам на тэрыторыі рэгіёну, а таксама, паводле наяўнай інфармацыі, на тэрыторыі Магілёўскай вобласці вербавалі грамадзян для працаўладкавання на будаўніных аб'ектах у Расіі. Пасля заканчэння работ, выкарыстоўваючы розныя падставы, з грамадзянамі зламысніКі не разлічваліся, паведамілі БелаПАН у прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама.

Цяпер следствам устаноўлена больш за 10 пацярпелых. Аднак, паводле наяўнай аператыўнай інфармацыі, гэтая лічба значна большая. Затрыманыя могуць мець дачыненне да здзяйснення іншых аналагічных злачынстваў. У сувязі з гэтым упраўленне па Гомельскай вобласці галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю МУС звярнулася да грамадзян, якія валодаюць інфармацыяй аб абставінах, сайдзельніках учыненага злачынства або пацярпелі ад злачыннай дзейнасці, з просьбай патэлефанавць па нумарах: (8-0232) 50-71-47, 50-84-09, (8-029) 622-60-59 або 102. Канфідэнцыйнасць і ананімнасць гарантуецца.

ПАМЯЦЬ

На месцы масавага самаспалення яўрэяў усё-ткі вырашана стварыць помнік

Месца масавага самаспалення яўрэяў — мірных жыхароў Мазыра (Гомельская вобласць) унесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь. Такое рашэнне прынята ў Мінску на пасяджэнні Беларускага рэспубліканскага навукова-метадычнага савета па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры.

Як зазначыў прэзідэнт Сусветнай асацыяцыі беларускіх яўрэяў Якаў Гутман (ЗША), восенню 1941 года пасля акупацыі горада нацыстамі 21 жыхар Мазыра ўчыніў акт самаспалення. Загінуўшыя яўрэі паўтарылі подзвіг сваіх продкаў — абаронцаў іудэйскай крэпасці Масада. У 73 годы нашай эры яны добраахвотна паішлі з жыцця, застаўшыся свабоднымі, каб не трапіць у рымскае рабства. Паводле слоў Я.Гутмана, муніцыпалітэт ізраільскага горада Ашдод 7 снежня 2005 года прысвоіў аднаму з паркаў горада імя герояў Мазыра. "Гісторыя Другой сусветнай вайны не ведае аналагу подзвігу, што здзейснілі яўрэі Мазыра", — падкрэсліў Я.Гутман. Разам з тым, паводле яго слоў, валун і мемарыяльны знак, устаноўленыя асацыяцыяй на месцы самаспалення ў 2003 годзе, былі знесены па рашэнні Мазырскага гарвыканкама.

Члены савета задаволілі просьбу Я.Гутмана і прапанавалі ўладам Мазыра да 1 студзеня 2009 года добраўпарадкаваць тэрыторыю помніка, а да 1 лістапада гэтага года аднавіць валун і памятны знак на месцы масавага самаспалення мазырскіх яўрэяў.

Апрача таго, статус гісторыка-культурнай каштоўнасці нададзены магіле яўрэяў — ахвяраў фашызму па вуліцы Рыжкова ў Мазыры, месцу масавага знішчэння яўрэяў — мірных жыхароў Мазыра на беразе ракі Прыпяць каля будынка рачнога вакзала, будынку па вуліцы Рыжкова,11 у Мазыры, цагляному дарожнаму слупу каля вёскі Ганчароўка Талачынскага раёна Віцебскай вобласці, мясцоваму песеннаму стылю выканання традыцыйных абрадавых і пазаабрадавых твораў аўтэнтычным фальклорным калектывам вёскі Галавенчыцы Чавускага раёна Магілёўскай вобласці, чатыром магілам ахвяраў фашызму ў Ельскім раёне Гомельскай вобласці, чатыром брацкім магілам савецкіх воінаў у Лоеўскім раёне Гомельскай вобласці, а таксама фрагментам дварцова-паркавага ансамбля ў гарадскім пасёлку Смілавічы Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці.

Марат ГАРАВЫ, БелаПАН.

ЗДАРЭННЕ

Забілі вартаўніка і скралі краны

У Хойніках на тэрыторыі перасоўнай механізаванай калоны "Хойніцкае" невядомы забіў вартаўніка прадпрыемства і ўкрал два аўтакраны.

Як паведамілі БелаПАН у прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, пасля выезду на месца следчай групы пры правядзенні аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў за сем кіламетраў ад райцэнтра быў знойдзены труп вартаўніка ПМК 1956 года нараджэння са шматлікімі сінякамі і раненнямі.

Пракуратура Хойніцкага раёна распачала справу па факце забойства, праваахоўныя органы праводзяць следчыя дзеянні для ўстанаўлення злачынцаў.

Алена ГЕРМАНОВІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
4 ВЕРАСНЯ 2008 г.

СЛЫШАЛИ?

Ольга Хижинкова уедет в ЮАР

Финал конкурса "Мисс мира -2008", который должен был пройти 4 октября в Киеве, состоится в южноафриканском Йоханнесбурге.

Как объясняют руководители самого престижного конкурса красоты, "рокировка была продиктована исключительно политическими соображениями".

Красавицы со всего мира съедутся в ЮАР 13 декабря.

Напомним, что Беларусь на конкурсе "Мисс мира-2008" представит 21-летняя Ольга Хижинкова. В мае этого года она завоевала титул "Мисс Беларусь".

Даша ПАВЛОВСКАЯ.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Данута БІЧЭЛЬ: «Заходзьце да мяне, хто ў смутку...»

Нядаўна пабачыла свет кніга ўспамінаў пісьменніцы Дануты Бічэль "Хадзі на мой голас". Гэта другая кніга з серыі "Гарадзенская бібліятэка", заснаваная незарэгістраваным гарадзенскім рухам "За Свабоду" пад патранатам Аляксандра Мілінкевіча.

"Захацелася скінуць з сябе салодкую няволю рыфмаў, гэты панцыр чарагалах, — піша Данута Бічэль ва ўступе да кнігі. — *Гэтая кніжка — яшчэ не развітанне, не запавет, але падвядзенне вынікаў. У маёй жыццёвай прыгодзе паэткі найважнейшымі з'явамі былі людзі, якія мяне любілі, якіх я любіла. Цяпер я зразумела, што пра людзей, якія істотна паўплывалі на мой лёс, у вершах не напішаш. Дасканалай мовай прозы я не валодаю. Таму атрымаліся эсэ. Вядома, гэтая кніжка няроўная. Я не ўсюды дала рады сваім эмоцыям. На мяжы паміж паэзіяй і прозай, калі ўдаецца заскочыць за далягляд думкі, дзе пачуццё і думанне зліваюцца ў адно, мае эсэ атрымаліся. "Заходзьце да мяне, хто ў смутку, душа кніжкі заўсёды адчынена..."*

Кніга багата аздоблена здымкамі. Аўтарка ўзгадвае айца **Уладзіслава Чарняўскага, Васіля Быкава, Алексея Карпюка, Артура Цяжкага, Ларысу Геніюш, Зоську Верас, Ірыну Крэнь, Анатоля Сыса, Хрысціну Лялько, Янку Брыля, Уладзіміра Караткевіча, Наталлю Арсенневу, Чэслава Мілаша...**

АНОНС

Молодежный приглашает...

9 сентября в Белорусском государственном молодежном театре — открытие 24-го театрального сезона.

Новый сезон откроет лирическая комедия Марины Ладо "Имел бы я златые горы..."

25-26 сентября состоится премьера нынешнего сезона - комедия "Полуночный Журден" по М.Булгакову. Главную роль в ней играет один из лучших белорусских актеров Сергей Журавель.

СПАДЧЫНА

Галіна КАНДРАЦЬЕВА:

«Варта імкнуцца не да хуткасці, а да якасці. І да еўрапейскага ўзроўню...»

Днямі адбылося неафіцыйнае адкрыццё музейнай экспазіцыі першага пускавога комплексу ў Нясвіжскім замку. Афіцыйныя ўрачыстасці з удзелам vip-асоб запланаваны на 26 верасня.

Ці ёсць на што паглядзець зараз у Радзівілаўскім замку? І ці сапраўды ўвесь замак паспеюць адрэстаўраваць да мая 2010 года, як загадаў А.Лукашэнка? На гэтыя і іншыя пытанні "Народная воля" папрасіла адказаць намесніка дырэктара музея-заказніка "Нясвіж" Галіну КАНДРАЦЬЕВУ.

— Першыя наведнікі ў нас ужо ёсць, — гаворыць Галіна Міхайлаўна. — Канешне, яшчэ засталіся некаторыя пытанні па экспазіцыі, якія мы дагэтуль вырашаем. Але спадзяюся, што да 26 верасня, калі адбудзецца ўрачыстае адкрыццё экспазіцыі, мы ўсё паспеем. У прынцыпе, усе жадаючыя наведаць замак могуць зрабіць гэта ўжо зараз. Асноўныя залы адкрыты, яны аформлены. Адзінае — ідзе, скажам так, падчыстка няроўнасцяў. Бо экспазіцыя — гэта ж не мёртвы арганізм, мы яе пастаянна будзем аднаўляць.

— А якія залы зараз ужо працуюць?

— Іх некалькі: зала гісторыі будаўніцтва і рэстаўрацыі замка; невялічкая зала, дзе размешчана фотавыстава інтэр'ераў замка канца XIX — пачатку XX стагоддзяў; інтэр'ерная зала архіваў бібліятэкі і выставачная зала, дзе выстаўлены партрэты з Радзівілаўскай калекцыі, а таксама крыху тых прадметаў, якія мы закупляем для музеяфікацыі другога пускавога комплексу. Іх няшмат, бо зала сама па сабе невялікая, але тым не менш можна паглядзець на тыя рэчы, якія набываюцца для замка.

— Ведаю, што на мінулым тыдні Нясвіжскі замак наведваў міністр культуры са світай памагатых. Чынавенства засталося задаволена ўбачаным?

— Я не прысутнічала ўвесь час побач з міністрам. Ведаю толькі, што вялікіх нараканняў на экспазіцыйныя залы ў яго не было.

— Чула, што з боку адміністрацыі замка сёння нашмат меней нараканняў і на працу цяперашніх будаўнікоў: маўляў, папярэднія менш працавалі і больш пілі...

— Думаю, не толькі я заўважыла, што ў Салігорскага трэста вельмі добрая арганізацыя працы. Яны сваіх працаўнікоў заахвочваюць рознымі спосабамі. У іх добра спланаваны працоўны дзень: калі абед, значыць, абед ва ўсіх без выключэння. І напрыканцы працоўнага дня, наколькі я ведаю, іх супрацоўнікі ведаюць, колькі заробілі за дзень. Гэта іх актывізуе і дысцыпліну.

— Будаўнікоў, наколькі я зразумела, кожны дзень возяць з Салігорска ў Нясвіж?

— Ёсць тыя, хто прыязджае і выязджае. А некаторыя жывуць тут, у вагончыках.

— Пастаўлена задача адкрыць замак ужо амаль праз паўтара года. Як думаеце, гэта рэальна?

— Гэта вельмі складаная задача. Прычым складаная не толькі для будаўнікоў, але і для музейшчыкаў. Бо складанне экспазіцыі — гэта не аднадзённая і нават не месячная праца мастакоў-афарміцеляў. Тым болей што яшчэ да канца не вырашана пытанне па экспанатах. Для таго каб зрабіць Нясвіжскі замак годным гістарычным аб'ектам, каб потым нам не было сорамна, мы павінны насычаць яго сапраўды рарытэтнымі прадметамі, закупляць антыкварныя рэчы. А яны на рынку каштуюць вельмі дорага. Калі мы пойдзем па шляху рэканструкцыі мэблі альбо будзем рабіць копіі партрэтаў, то ў выніку атрымаем бутафорыю, а не вартую памятніка ЮНЕСКА экспазіцыю. Дарэчы, на сустрэчы з міністрам мы таксама ўзнімалі гэтае пытанне.

Таму мне цяжка сказаць, ці атрымаецца ўсё ў маі 2010 года. Падобныя экспазіцыі не робяцца злёту, гэта вельмі крапатлівая праца. І асобныя музеі, калі вы ведаеце гісторыю, напрыклад, тых жа Пецярбургскіх дварцоў, ствараліся дзесяцігоддзямі. Мы закупляем тыя прадметы, якія нам сапраўды патрэбныя. Але ў нас няма магчымасць проста пайсці ў магазін і выбраць патрэбныя нам рэчы.

— Калі не памыляюся, сёння ўсе рэчы для замка закупляюцца за дзяржаўны кошт...

— Так. Будаўніцтва добра фінансуецца, выконваецца інвестыцыйная праграма, мы вельмі ўдзячныя за гэта. А вось з музеяфікацыяй больш складана, там што Міністэрства культуры атрымлівае грошы на ўсе музеі, а потым іх вельмі складана падзяліць. Тым больш яшчэ ёсць Мір, які таксама рыхтуецца да адкрыцця. Але мы ўвесь час кажам пра тое, што ў спісе ЮНЕСКА ёсць два аб'екты — Мір і Нясвіж, і да іх павінна быць больш пільная увага. І яшчэ раз скажу, усе беларусы павінны імкнуцца да таго, каб там стварыць сапраўды годныя экспазіцыі. Напэўна, варта імкнуцца не да хуткасці, а да якасці. І да еўрапейскага ўзроўню.

— Можа, ёсць сэнс прыцягнуць спонсараў, якія б дапамаглі з антыкварыятам?

— Мы спрабавалі неаднаразова рабіць такія захады. Але на жаль, пакуль нас фінансуе толькі дзяржава. Мы прымем любую дапамогу, асабліва калі гэта тычыцца закупкі нейкіх каштоўных рэчаў для музея...

Марына КОКТЫШ.

Турыстам на тэрыторыю замка ўваход часова забаронены.

Так выглядаюць адрамантаввныя фасады.

Цудоўнае руковенькае крэсліца XVIII стагодзя музейшчыкі знайшлі ў адным з беларускіх магазінаў. Па нашай інфармацыі, каштавала яно прыблізна сем тысяч долараў.

Плануецца, што ў адным з залаў Нясвіжскага замка будзе працаваць бар і рэстаран. У замку ўжо нават расставілі мэблю для бара.

Будоўля.



З гэтага балкона ў свой час Радзівілы глядзелі тэатральныя прадстаўленні.

Калі мы былі на аб'екце, будаўнікі сапраўды самааддана працавалі.



Гэтую арку рамантуюць ужо больш за год...

ТЫМ ЧАСАМ

Уладзімір ГРЫДЗЮШКА: «Нельга ператвараць рэстаўрацыю будынка тэатра ў крыніцу заробку мастакоў...»

Члены Беларускага рэспубліканскага навукова-метадычнага савета па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры не зацвердзілі эскізы мастацкага афармлення інтэр'ераў Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета.

Удзельнікі пасяджэння, якое прайшло ў Мінску, зазначылі, што прадстаўленыя навуковым кіраўніком праекта рэстаўрацыі помніка **Людмілай Івановай** эскізы не гарманіруюць з аўтарскай задумай вядомага дойліда, доктара архітэктуры, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі **Іосіфа Лангбарда**, па праекце якога ў 1936—1937 гадах быў узведзены гэты будынак.

Апрача таго, як мяркуюць спецыялісты, у тым ліку доктар архітэктуры **Армен Сардараў**, доктар мастацтвазнаўства **Надзея Высоцкая** і дырэктар УП "Праектрэстаўрацыя" **Уладзімір Сіняўскі**, пры распрацоўцы эскізаў іх аўтары дапусцілі змешванне стыляў і выкарыстанне матэрыялаў, якія не прымяняліся ў мастацкім афармленні інтэр'ераў будынка тэатра ў даваенныя і пасляваенныя гады, не ўлічылі нацыянальныя традыцыі ў галіне балета, а таксама ўключылі ў свае прамановы запазычанні са спадчыны вядомага тэатральнага мастака, графіка і жывапісца **Льва Бакста**. Разам з тым, як зазначана на пасяджэнні, прапанаваны варыянт мастацкага афармлення загрувашчвае інтэр'еры тэатра і ставрае асяроддзе, у якім чалавек адчувае сябе дыскамфортна.

Як падкрэсліў старшыня савета, намеснік міністра культуры Уладзімір Грыдзюшка, нельга ператвараць рэстаўрацыю будынка тэатра ў месца для рэалізацыі ідэй і крыніцу заробку мастакоў, скульптараў і майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Як паведамляе БелаПАН, члены савета вырашылі ў бліжэйшы час працягнуць разгляд гэтага пытання ў памяшканнях тэатра.

Нагадаем, што работы па рэканструкцыі і рэстаўрацыі помніка архітэктуры прапануецца завяршыць да канца гэтага года.

Народная Воля http://www.nv-online.info
4 ВЕРАСНЯ 2008 г.

ЗДАРЭННІ

Памёр ад укусаў шэршняў

У Пінскім раёне ад укусаў шэршняў загінуў 45-гадовы мясцовы жыхар.

Як паведамілі БелаПАН у Пагост-Загародскай участковай бальніцы, жыхара вёскі Ганчары да іх даставілі каля 11.00. Прынятыя медыкамі экстранныя меры па выратаванні пацярпелага беспаспяховымі.

Мужчына разам з групай мясцовых жыхароў займаўся нарыхтоўкай дроў у лесе непадалёк ад вёскі. Верагодна, ён натрапіў і нейкім чынам патрывожыў гняздо шэршняў, якія і пакусалі яго.

Ларыса ШЫГАНАВА.

Разулі сярод белага дня

Днём на аўтобусным прыпынку "Шашэйная" на Маскоўскім праспекце ў Віцебску малады чалавек зняў і скраў у мужчыны чаравікі.

Той звярнуўся ў міліцыю і рабаўніка хутка затрымалі, паведамляе прас-цэнтр УУС Віцебскага аблвыканкама. Нават міліцыянераў гэты выпадак здзівіў: да чаго ж мы дажыліся, калі разуць могуць сярод белага дня ў цэнтры буйнога горада!

ТРАДЫЦЫІ

У гонар выдатнага земляка

Упершыню ў статусе міжнароднага прайшоў на Віцебшчыне пленэр імя Івана Хруцкага, першага з нашых суайчыннікаў, які атрымаў званне акадэміка жывапісу.

Варта зазначыць, што гэта адбылося ў 1839 годзе, калі мастаку было толькі 29 год, а з часу атрымання ім дыплома Пецярбургскай акадэміі мастацтваў прайшло ўсяго 3 гады.

Пленэр, пра які ідзе гаворка, традыцыйны. Сёлета ён праводзіўся ўжо ў 18-ты раз, але ў ім упершыню, акрамя мастакоў з Віцебшчыны, бралі ўдзел жывапісцы з Сербіі і Расіі.

Пленэр праходзіў у Верхнядзвінскім раёне, да якога акадэмік Іван Хруцкі не меў дачынення. Нарадзіўся мастак у мястэчку Ула Лепельскага павета (цяпер гэта — Бешанковіцкі раён), а ў 1845 годзе стала пасяліўся на Полаччыне, дзе і памёр у 1885 годзе.

Найбольш паспяхова Хруцкі працаваў у жанрах партрэта і нацюрморта. Удзельнікі сёлетняга пленэру засяродзілі ўвагу на партрэтах і пейзажах, не імкнучыся працаваць "пад Хруцкага": па-першае, няма такіх фарбаў, а па-другое, на ўласцівыя пэндзлю Івана Фаміча нацюрморты з шыкоўнымі стравамі ў сучасных жывапісцаў заробкаў не хопіць. Куды прасцей намаляваць аўтапартрэт альбо выяву калегі, а яшчэ лепш — краявід. Балазе, удзельнікам пленэру паказалі шэраг маляўнічых мясцін Верхнядзвінчыны.

Выніковая выстава твораў, напісаных у час пленэру, адбудзецца ў Віцебску на пачатку 2009 года.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

СЛЫШАЛИ?

Российского ученого записали в Нобелевские лауреаты Беларуси

Недавно киностудия "Беларусьфильм" презентовала руководству Департамента по кинематографии Министерства культуры две новые картины.



Как написано на сайте киностудии, одна из них - "короткометражка" "Лазер Алферова" — посвящена "жизненному и научному пути единственного Нобелевского лауреата Беларуси — физика Жореса Алферова, родившегося в Витебске".

Можно ли считать российского ученого с белорусскими корнями - "единственным Нобелевским лауреатом Беларуси"?

Доктор исторических наук, профессор БГПУ им.М.Танка, автор книги "Нобелевские лауреаты с белорусскими корнями" Эммануил Иоффе считает, что нет.

"Пять уроженцев Беларуси действительно стали лауреатами Нобелевской премии, у девяти лауреатов Нобелевской премии родители или родственники из Беларуси, — сказал Эммануил Григорьевич "Народной воле". — Например, первую премию получил Саймон Кузнец из Пинска в области экономики (он американский ученый). Второй - английский ученый Аарон Клуг в области химии и биологии (родился в местечке Зельва Гродненской области). Третий - российский ученый — Жорес Алферов. Среди лауреатов Нобелевской премии мира Шимон Перес и Менахем Бегин - у них тоже есть белорусские корни".

Выходцами из Беларуси были родители и лауреата Нобелевской премии 1979 года американского физика-теоретика Шелдона Ли Глэшоу. Отец американского физика Мартина Льюиса Перла (Нобелевская премия 1995-го) родился в Пружанах. А отец лауреата 2000 года - американского физика Алана Джея Хигера - витебчанин.

Кстати, книгу Эммануила Иоффе еще можно купить в белорусских книжных магазинах.

К сведению

От Беларуси на Нобелевскую премию были номинированы писательница Светлана Алексиевич, правозащитник Алесь Беляцкий, поэт Рыгор Бородулин, политик Станислав Шушкевич.

Для справки

Картина "Лазер Алферова" — это первый опыт сценариста Владимира Мороза в качестве кинорежиссера.

Владимир Викентьевич - автор сценариев известных белорусских документальных фильмов, таких как "Айцец Сергій" (2007, режиссер С.Гайдук), "Леанід Левін. Вайна і любоў" (2006, режиссер О.Дашук), "Пад крылом анёла" (2005, режиссер С.Гайдук), "Пакуль зямля трывае" (2005, режиссер С.Гайдук), "Скарбніца слова" (2006, режиссер С.Смирнов), "Чернобыльский крест" (2006, режиссер А.Алай), "Минск, моя столица" (2002, режиссер В.Цеслюк).

Алина ВЕТРОВА.

СТОЛИЦА

В Минске вновь отключают воду

Для подготовки тепловых сетей города Минска к работе в зимних условиях УП "Минсккомунтеплосеть". Так, в сентябре горячая вода будет отключена у потребителей по улицам: Азгура, 1, 1а, 16, 3, 5, 8; Антоновская, 22, 24, 28, 30, 32; Берестянская, 5, 6; Богдановича, 29, 46, 48, 50, 52, 54, 56, 58, 60; В.Хоружей, 21; З.Горка, 12, 14, 16; Захарова, 4, 44, 50в, 53, 63, 67 к.1, 73а, 77а; Ивановская, 34, 36; Киселева, 9; Козлова, 16, 33а; Коммунистическая, 14, 16, 18, 19, 52, 86; Кропоткина, 47, 51, 55; Красная, 3, 5, 19; Куйбышева, 8, 10, 55, 57, 61 к.1, 2, 3; Машерова, 30, 80; П.Бровки, 32; пер.Броневой, 10а; Первомайская, 11, 20 к.1, 2, 3, 24 к.2, 3, 26 к.1, 2; Пугачевская, 7, 9, 11; Пулихова, 7 к.2, 25; Старовиленская, 44, 48, 95, 95а, 97; Сторожевская, 8, 8а; Червякова, 2 к.2, 3, 5, 86; Я.Коласа, 15, 17, 19.

Во время испытаний возможны повреждения теплопровода. При обнаружении течи воды или парения из земли, колодцев, провалов грунта необходимо срочно сообщить диспетчеру УП "Минсккоммунтеплосеть" по тел. 267-88-88 или в ближайшие КУП "ЖЭУ".

Ремонтники обещают максимально сократить сроки отключения воды. И уж точно гарантируют, что без воды "счастливчикам" не придется оставаться более 14 суток.

Остается, правда, вопрос: почему все ремонтные работы не были закончены летом?

СКАЖЫ, ВІТАЛЬ...

Крэдыт для маладых спецыялістаў

Падкажыце, ці праўда, што маладыя спецыялісты могуць атрымаць беспрацэнтны крэдыт. Хачу звярнуцца з падобнай просьбай у "Беларусбанк".

Марына Акіёнак, Жлобінскі раён.

— Льготныя крэдыты для маладых спецыялістаў замацаваны адпаведным указам Аляксандра Лукашэнкі. Яны прадастаўляюцца маладым спецыялістам (выпускнікам дзяржаўных навучальных устаноў), якія накіраваны для працы не па месцы жыхарства бацькоў. Галоўнае, каб вы працавалі ў арганізацыі, якая фінансуецца з дзяржаўнага бюджэту.

Згодна з указам, крэдыты прадастаўляюцца цягам двух гадоў пасля заканчэння навучальных устаноў у памеры 15-разовага бюджэту пражытачнага мінімуму, тэрмінам да 5 гадоў з уплатай 25 працэнтаў стаўкі рэфінансавання Нацбанка Беларусі. Крэдыт прадастаўляецца на пакупку хатняй маёмасці (мэбля, халадзільнік, тэлевізар, газавая ці электрычная пліта, пральная машына) і таварaў першай неабходнасці (адзенне, абутак, набор пасцельнай бялізны, посуд) айчыннай вытворчасці.

Для атрымання льготнага крэдыту вам неабходна звярнуцца ў арганізацыю па месцы працы, з тым, каб былі афармлены дакументы на ўключэнне вас мясцовымі ўладнымі органамі ў адпаведныя спісы.

У армію не бяруць псіхічна хворых і крымінальнікаў...

Мая маці — інвалід першай групы. Я адзіны яе кармілец. Падкажыце, калі ласка, ці буду я прызваны на тэрміновую вайсковую службу? І яшчэ, якія катэгорыі грамадзян не падлягаюць прызыву ў армію?

Дзмітрый Кладаў, Гродна.

— Зараз вы атрымалі адтэрміноўку ад прызыву па сямейных абставінах, але гэта не значыць, што ў армію вас не змогуць забраць. Прызыўны ўзрост у Беларусі — да 27 гадоў.

А вось катэгорыі тых людзей, якія ўвогуле не падлягаюць прызыву на вайсковую службу: людзі, якія маюць судзімасць, грамадзяне, якія адбылі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі ў папраўчых установах, грамадзяне, што адбываюць пакаранне ў месцах пазбаўлення волі, грамадскіх ці папраўчых работ, абмежавання волі ці арышту. Таксама не падлягаюць прызыву на вайсковую службу людзі, у дачыненні да якіх судом прыменены прымусовыя меры бяспекі і лячэння, а таксама людзі, у дачыненні да якіх ажыццяўляецца крымінальны праследаў ці крымінальная справа накіравана ў суд.

Колькі плаціць за кватэру можна даведацца ў інтэрнэце

Чуў, што ў інтэрнэце можна даведацца аб запазычанасці за кватэрны тэлефон, а таксама за камунальныя паслугі. Ці так гэта?

Ігар Слясарчык, Мінск.

— Так. Аб запазычанасці за кватэрны тэлефон можна даведацца не выходзячы з дома ці офіса. Гэта можна зрабіць на сайце www.beltelecom.by. Тут неабходна пазначыць нумар тэлефона і прозвішча абанента.

А для таго, каб даведацца, колькі трэба плаціць за кватэру, неабходна завітаць на афіцыйны сайт Мінгарвыканкама — www.minsk.gov.by. На гэтай старонцы неабходна знайсці рубрыку "гарадская гаспадарка", а ў ёй спасылку "Прагляд рахункаў на жыллёва-камунальныя і іншыя паслугі". Пасля рэгістрацыі вы зможаце атрымаць доступ да гэтай паслугі. Дарэчы, яна платная. Адзінае абмежаванне: доступ да гэтай паслугі не дазваляецца тады, калі вы павінны сталічным камунальшчыкам больш за 10.000 рублёў.

Хачу паслухаць алімпійскую песню

Падкажыце, дзе можна знайсці песню, якая выконвалася падчас адкрыцця Алімпіяды ў Пекіне?

Вера Майкова, Гродзенская вобласць.

Падчас цырымоніі адкрыцця Алімпіяды кітайскі спявак Лю Хуань і брытанская спявачка Сара Брайтман у дуэце выканалі галоўную песню пекінскай Алімпіяды. Яна называецца "Ты і я". У перакладзе на рускую мову там наступныя словы:

Ты и я
Из одного мира.
Сердце к сердцу
Мы — одна семья.
Ради мечты мы преодолеваем
Тысячи миль.
Мы встретились в Пекине,
Пришли вместе
разделить радость.
Ты и я
Из одного мира.
Мы навсегда — одна семья.

Знайсці гэтую песню вельмі складана. Не дапамог і Нацыянальны Алімпійскі камітэт Беларусі. Праўда, калі вам так хочацца пачуць яе зноў, то трэба скачаць у інтэрнэце ролік з адкрыцця Алімпіяды.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Разбудзіце іх...

Чаму ў нашай краіне столькі праблем? Таму што ў нас шмат людзей, якім на ўсё, прабачце, наплёваць. Іх абыякавасць — вынік дрэннага выхавання, нізкага ўзроўню адукацыйнасці, цемрашальства.

Не чытаюць такія людзі "Народную волю". А давайце ім дапаможам. Разбудзім іх! Пераканаем, зробім спецыяльна за іх **перадаплату** за нумары ў верасні — снежні. Калі ёсць магчымасць, ахвяруйце для іх невялікую суму. Зрабіце гэта ў бліжэйшыя дні. Для гэтага зазірніце ў любы філіял "Беларусбанка" ці наведайце бліжэйшае паштовае аддзяленне. Мінчане могуць апаратыўна зрабіць **перадаплату** таксама праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 328-63-93 ці 328-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін і па любым адрасе. Не маеце магчымасці аплаціць за ўсе нумары, якія выйдуць у верасні - снежні — зрабіце гэта за месяц, два, тры...

Нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы выдання газеты, тарыфы па перадаплаце ранейшыя: на месяц — 9500 рублёў для індывідуальных чытачоў і 15.000 рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Заўважым: паколькі кошт газеты пры рэалізацыі ў розніцу з новага года павысіўся, то выгадна рабіць перадаплату, з тым каб газета дастаўлялася дахаты.

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

З дапамогай "Народнай волі" разбудзім усіх абыякавых!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759

(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа	Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г.		
(ненужное зачеркнуть)		
Плательщик	Пеня	
	Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759

(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа	Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г.		
(ненужное зачеркнуть)		
Плательщик	Пеня	
	Всего	

КВИТАНЦИЯ
Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов.

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г.
(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется отчетливо **печатными буквами** и **обязательно** отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: если можете — укажите, пожалуйста, код подъезда или номер дом.телефона; в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

Свае пытанні ў рубрыку дасылайце на адрас: 220030, Мінск, вул.Энгельса 34а, рэдакцыя газеты "Народная воля" з паметкай "Скажы, Віталь...".

Вядучы рубрыкі Віталь ГАРБУЗАЎ.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 3.09.2008 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №